

У ПОШУКАХ «ХУТКАЙ» ЗАРПЛАТЫ

ЧЫРВОНКА

МУЖЧЫНСКІЯ РУКІ ДЛЯ... ЖАНОЧЫХ БРОВАК

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 КАСТРЫЧНІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 188 (29055)


# ВЕДАЮЧЫ БРОД...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхару вёскі Вялікія Дольцы Ушацкага раёна Юрыю КАЗАЧОНКУ на сваім «іжы» часта даводзіцца пераязджаць уброд раку Ушачу паміж азёрамі Замошша і Царкавішча.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КАРАНІК, міністр аховы здароўя:**
*«Кампанія прышчэплівання ў краіне ўжо пачалася. Спадзяюся, што, калі яна пройдзе пасняхова, эпідэміі грыпу сёлета не будзе. Летась яе не было, таму што быў дасягнуты высокі ўзровень вакцынацыі. Тады было прышчэплена больш за 3,7 мільёна чалавек, з іх каля 950 тысяч — да 18 гадоў. На працягу апошніх сезонаў, калі вакцынаваныя складаюць каля 40 % насельніцтва краіны, захваральнасць знаходзіцца на нізкім узроўні».*

## КОРАТКА

• **Венскі баль зладзяць 14 снежня ў Купалаўскім тэатры.**



• КДК праводзіць у рэгіёнах «гарачыя» лініі па закупках у насельніцтва лішкаў прадукцыі. Жыхары рэгіёнаў могуць паведаміць пра недахопы і парушэнні, а таксама ўнесці прапановы па ўдасканаленні нарыхтоўчай дзейнасці.

• **Галоўны трэнер мінскага «Дынама» Сяргей Гурэнка дыскваліфікаваны на пяць матчаў.**

• Прадпрыемствы «Беллеграма» павялічваюць экспарт у ЕС і будуць больш актыўна працаваць з Кітаем.

• **Да пілотнага праекта па маркіроўцы абутку сродкамі ідэнтыфікацыі далучыліся 45 прадпрыемстваў.**

• Двое мінчан прасілі ў дзяцей тэлефоны і праз камп'ютарную праграму бралі мікрапазыкі.


ISSN 1990 - 763X


## Бягучыя і перспектыўныя задачы развіцця

*Выступленне старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М. У. МЯСНІКОВІЧА на адкрыцці сёмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*



Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя!

Сёмая сесія Савета Рэспублікі шостага склікання сёння пачынае сваю работу. Парадак дня сесіі вельмі насычаны. Трэба будзе разгледзець больш за 40 законапраектаў. Ключавымі з'яўляюцца законапраекты «бюджэтнага пакета».

Паказчыкі мясцовых бюджэтаў па даходах на 2020 год разлічаны з захаваннем дзеючых нарматываў адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў і збораў, якія паступаюць у бюджэты абласцей. Пры гэтым прашу звярнуць увагу: плануецца захаваць аб'ёмы датацый, што перадаюцца абласцям, на ўзроўні не ніжэй бягучага года, незалежна ад планаванага паступлення ўласных даходаў. Прадугледжваюцца і іншыя меры больш актыўнага развіцця рэгіёнаў. Савету Рэспублікі як палаце тэрытарыяльнага прадстаўніцтва мэтазгодна падтрымаць такія падыходы ўрада і Мінфіна пры разглядзе законапраекта аб рэспубліканскім бюджэце на 2020 год. Разлічваем, што на месцах скарыстаюцца гэтымі дадатковымі магчымасцямі для росту валавога рэгіянальнага прадукту і стварэння новых рабочых месцаў.

СТАР. 2

## Годна перадаць парламенцкую эстафету

*Выступленне старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. АНДРЭЙЧАНКІ на адкрыцці сёмай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*



Паважаныя дэпутаты, члены ўрада і запрошаныя! Пачынае работу сёмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

Гэта заключная сесія для цяперашняга складу дэпутацкага корпуса, з завяршэннем якой будзе перагорнута яшчэ адна старонка ў гісторыі беларускага парламентарызму.

У краіне набірае ход выбарчая кампанія, актыўна адбываецца працэс вылучэння кандыдатаў у новы склад парламента. І ўжо ў хуткім часе шостае скліканне Палаты прадстаўнікоў перадасць эстафету нанава выбраным дэпутатам.

Разам з тым свае выбарчыя перавагі грамадзяне ў многім фарміруюць зыходзячы з ацэнкі менавіта нашай дзейнасці. Таму задача ў нас з вамі, паважаныя калегі, адна: годна выканаць увесь той аб'ём работы, які мы запланавалі. Тым больш што ўсе пытанні, уключаныя ў заканадаўчы парадак дня, падпарадкаваныя дасягненню стратэгічных мэт, замацаваных у пяцігадовай праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

У немалой ступені яе рэалізацыя залежыць ад эфектыўнасці бюджэтнай палітыкі. У наступным годзе яна традыцыйна будзе накіравана на забеспячэнне збалансаванасці рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, стварэнне ўмоў для ўстойлівага эканамічнага росту, умацненне сацыяльнай накіраванасці выдаткаў, уключаючы павышэнне дабрабыту работнікаў бюджэтнай сферы і падтрымку шматдзетных сем'яў.

СТАР. 2

# Бягучыя і перспектыўныя задачы развіцця

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

2020 год — завяршальны год пяцігодкі. З улікам аб'ектыўных праблем развіцця эканомікі нашай дзяржавы на працягу папярэдніх чатырох гадоў (а яны выкліканы ў асноўным знешнімі фактарамі) заданні 2020 года павінны быць вельмі напружанымі. Гэта запатрабуе высокай канцэнтрацыі намаганняў не толькі кіраўнікоў і персаналу органаў кіравання, але і работнікаў усіх арганізацый і ў першую чаргу занятых у сферы матэрыяльнай вытворчасці і паслуг. Кожны з 4 мільёнаў 338 тысяч чалавек занятага насельніцтва краіны павінен быць матываваны на высокапрадукцыйную працу.

Паважаныя калегі!

У мэтах выканання даручэнняў і мэтавых установак кіраўніка дзяржавы, дадзеных 19 верасня 2019 года пры разглядзе прагнозных дакументаў на 2020 год, Савет Рэспублікі накіраваў ва ўрад шэраг прапаноў, якія дазваляюць забяспечыць, на нашу думку, больш высокія тэмпы эканамічнага росту без празмернага стымулявання ўнутранага попыту за кошт нарошчвання аб'ёмаў экспарту і актывізацыі інвестыцыйнай дзейнасці. Таксама прапанавана на працягу першага паўгоддзя 2020 года распрацаваць праект Асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2025 года. Гэты дакумент патрэбен з усіх пунктаў гледжання.

Сур'ёзным інструментам рэалізацыі задач сацыяльна-эканамічнага развіцця з'яўляецца актуальнае заканадаўства. Савет Рэспублікі неаднаразова звяртаўся ва ўрад з канкрэтнымі прапановамі па распрацоўцы адсутных праектаў нарматыўных прававых актаў, у першую чаргу законапраектаў, прадугледжаных Праграмай пяцігодкі і Дэкрэтам Прэзідэнта ад 23 лістапада 2017 года № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва».

Разлічваем, што адпаведныя намаганні будуць прынятыя ўжо ў гэтым 2019 годзе.

Паважаныя сябры!

Наша дзейнасць павінна ўлічваць падыходы па паглыбленні інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй, сфармуляваныя ў абноўленай Праграме дзеянняў. Савет Рэспублікі прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы гэтага дакумента. Ураду, Нацыянальнаму банку з удзелам парламентарыяў і іншых зацікаўленых трэба будзе распрацаваць больш за 30 беларуска-расійскіх дарожных картаў, якія рэгулююць сацыяльна-эканамічную дзейнасць у Саюзнай дзяржаве. На прынцыпах суверэннай роўнасці дзяржаў-удзельніц. З улікам устаноўленых кіраўнікамі дзяржаў Беларусі і Расіі тэрмінаў — снежань 2019 года — значны аб'ём работы давядзецца выконваць дзеючаму шостаму скліканню Савета Рэспублікі.

Калегі!

Цэлы блок законапраектаў у рамках гэтай сесіі плануецца прыняць у сферы канстытуцыйнага заканадаўства. Найважнейшы з іх — праект новага закона «Аб судова-экспертнай дзейнасці», якім упершыню прапануецца вызначыць прававыя асновы судова-экспертнай дзейнасці, яе навукова-метадычнага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

Павышэнню эфектыўнасці рэгулявання дзейнасці суб'ектаў натуральных манаполій будзе садзейнічаць карэкціроўка Закона «Аб натуральных манаполіях». У прыватнасці, распрацоўшчыкі законапраекта лічаць неабходным аптымізаваць пералік сфер натуральных манаполій, укараніць інстытут публічных слуханняў і іншыя навацыі.

У заканатворчым партфелі шмат ініцыятыў, якія накіраваны на вырашэнне паўсядзённых праблем людзей. Гэта законапраекты «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг», «Аб ахове працы», «Аб пажарнай бяспецы», «Аб персанальных даных» і іншыя.

Паважаныя ўдзельнікі пасяджэння!

Савет Рэспублікі і дзеючы пры ім Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання адпрацоўваюць новыя кірункі рэгіянальнага развіцця. Мяркую, што гэтыя пытанні актуальныя не толькі ў перыяд выбарчых кампаній. Так, напрыклад, у верасні гэтага года ў Бялыніцкім раёне Магілёўскай вобласці мы дэталёва разгледзелі ўдасканаленне работы з сельскім насельніцтвам. Акрамя таго, намецілі шэраг мер, якія датычацца дзейнасці асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў. Пакуль гэтая работа ў стадыі станаўлення, але ўжо можна разлічваць на яе эфектыўнасць. У цэлым Савет Рэспублікі прымае ўдзел у вырашэнні практычна ўсіх сістэмных задач сацыяльна-эканамічнага будаўніцтва, пастаўленых кіраўніком нашай дзяржавы.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Актыўная і насычаная міжнародная дзейнасць у міжсесійны перыяд была накіравана на пашырэнне міжпарламенцкага супрацоўніцтва. Ключавым мерапрыемствам летняга перыяду стаў VI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які прайшоў у Санкт-Пецярбургу. Удзел у Форуме Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі і Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі У. У. Пуціна, які ўжо стаў традыцыйным, не толькі напоўніў новай якасцю і зместам міжрэгіянальнае ўзаемадзеянне, але і ўключыў гэта мерапрыемства ў шэраг найважнейшых палітычных падзей беларуска-расійскага парадку дня.

Форумы рэгіёнаў Беларусі і Расіі сталі добрым прыкладам для наладжвання больш цеснага супрацоўніцтва з іншымі краінамі. Па ініцыятыве Савета Рэспублікі ў ліпені 2019 года ўпершыню такі форум арганізаваны з Узбекістанам. Члены Савета Рэспублікі таксама прынялі актыўны ўдзел у Беларуска-польскім форуме «Добрасуседства-2019». Мерапрыемствы, якія адбыліся, сталі буйнымі перагаворнымі пляцоўкамі, работа якіх спрыяла ўмацаванню міжрэгіянальных эканамічных і гуманітарных сувязяў.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Дазвольце павіншаваць вас з пачаткам сёмай сесіі Савета Рэспублікі. Жадаю ўсім прадукцыйнай работы.

# Годна перадаць парламенцкую эстафету

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Складанне галоўнага фінансавага дакумента патрабуе ўважлівага ўліку ўсіх фактараў і рызык. Зразумела, тое, што нацыянальныя падатковыя правілы застаюцца стабільнымі, дазваляе нам сёння больш выразна прагназаваць асноўныя параметры бюджэту — у першую чаргу па даходах. І цяпер трэба ўважліва паглядзець на прыярытэты фінансавання, а гэта — забеспячэнне апераджальнага развіцця навукаёмістых галін і выраўноўванне эканамічнага патэнцыялу рэгіёнаў пры безумоўным выкананні краінай усіх знешніх і ўнутраных абавязацельстваў.

Прадказальнасць падатковых правілаў важная і з таго пункту гледжання, што яна дасць магчымасць больш упэўнена планаваць сваю бізнес-стратэгію як айчынным прадпрыемствам, так і замежным інвестарам. Але ў стварэнні стабільнага дзелавога асяроддзя варта зрабіць яшчэ адзін важны крок. Гаворка ідзе пра ўдасканаленне карпаратыўнага права, і перш за ўсё заканадаўства па пытаннях гаспадарчых таварыстваў. Ад вынікаў гэтай работы шмат у чым будуць залежаць пазіцыі Беларусі ў рэйтынгу Сусветнага банка «Вядзенне бізнесу».

Акрамя таго, нам трэба будзе прыняць шэраг рашэнняў па рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. Запланаваныя меры закліканы павысіць устойлівасць беларускіх кампаній на гэтым маштабным рынку і ліквідаваць шэраг тэхнічных бар'ераў ва ўзаемным гандлі. Чарговым крокам у гэтым кірунку стане карэкціроўка законаў у сферы натуральных манаполій, транспартнай дзейнасці, электрасувязі, метралагічнага забеспячэння, тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі.

У сучасную эпоху пры фарміраванні стратэгіі развіцця дакладна выбудаваць па ранжыры эканамічныя і сацыяльныя мэты практычна немагчыма. Яны самым цесным чынам пераплецены. Прычым менавіта якасць жыцця, якая дазваляе раскрыць творчы патэнцыял асобы, сёння становіцца адным з вядучых фактараў эканамічнага росту.

Галоўны наш рэсурс — чалавечы капітал, высокія прафесіяналы, запатрабаваныя ва ўсім свеце. І каб Беларусь магла паспяхова канкурыраваць у барацьбе за кваліфікаваныя кадры, нам важна пастаянна паляпшаць не толькі бізнес-клімат, але і ўмовы жыцця і працы нашых грамадзян.

Напрыклад, мы зрабілі шэраг крокаў насустрач бізнесу ў працоўным заканадаўстве. Але аказалася, што пытанні аховы працы некаторых катэгорый работнікаў не ўрэгуляваны, роўна як нідзе не прапісаныя абавязкі іх наймальнікаў у гэтай галіне. А гэта ж базавыя пытанні, звязаныя са здароўем, а часам і жыццём людзей. Сёння мы запаўняем гэты прабел, прапаноўваючы над адпаведнымі папраўкамі.

Акрамя таго, нам трэба будзе завяршыць работу з законапраектамі, якія непасрэдна датычацца павышэння якасці аказання медыцынскіх і жыллёва-камунальных паслуг насельніцтву, абароны экалогіі, забеспячэння законнасці і правапарадку.

Шэраг сур'ёзных задач намечаны да выканання і ў рамках нашай міжнароднай праграмы. Тут у цэлым створаны надрэнны зачын. Гэта відаць і па дынаміцы двухбаковых сувязяў, і па пытаннях, з якімі працуюць парламенцкія групы дружбы.

Важна, што разам з рашэннем чыста палітычных задач мы ўсё больш актыўна выходзім на канкрэтныя эканамічныя праекты. Напрыклад, дэпутаты і прадстаўнікі бізнесу Германіі сёння ўважліва вывучаюць магчымасці міжрэгіянальнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва з Беларуссю, перспектывы вытворчай каапераціі ў шэрагу інавацыйных сфер.

Турэцкія і японскія парламентарыі праявілі сур'ёзную цікавасць да беларускага сектара інфармацыйных тэхналогій. А з нашымі польскімі калегамі мы вядзём ужо практычна сістэмны дыялог па самым шырокім коле тэм, якія закранаюць эканоміку, гандаль, інвестыцыі, спорт, турызм і многае іншае.

Радуе, што гэтая актыўнасць прыносіць рэальны плён у выглядзе міжнародных пагадненняў і ўзаемавыгадных кантрактаў. Аб'ёмны пакет такіх дакументаў падпісаны нядаўна і па выніках першага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана, праведзенага ў Мінску па ініцыятыве парламентаў дзвюх краін.

Падобных прыкладаў можна прывесці шмат. І ўсе гэтыя сувязі і напрацоўкі нам ні ў якім разе нельга страціць. Мяркую, з гэтым салідарныя і кіраўнікі дыпламатычных місій, якія ўнеслі немалы ўклад у развіццё дыялогу. Бо акрамя прамой эканамічнай выгады для грамадзян нашых краін, умацаванне даверу і імкненне супрацоўнічаць без палітычнай прадузятасці дапамагаюць нам лепш разумець адзін аднаго ў міжнародных арганізацыях.

А гэта сёння — вельмі важная задача. Улічваючы трывожныя падзеі, якія адбываюцца ў свеце, аб'яднальны парадак дня ў духу ініцыятыў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь запатрабаваны як ніколі.

Мы адчуваем гэта па той атмасферы, якая складваецца ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ. І мы ўдзячныя сваім калегам за падтрымку. Летам у Люксембургу была аднагалосна прынятая наша чарговая, ужо трэцяя па ліку ў гэтым скліканні, рэзалюцыя.

Паступова павялічваецца колькасць прыхільнікаў уладкавання Еўразійскага кантынента на прынцыпах даверу і партнёрства. Яскравы прыклад таму — Нарада спікераў парламентаў краін Еўразіі. Гэта маладая, але хутка набіраючая міжнародную вагу дыялогавая платформа. Калі на першай нарадзе было ўсяго 18 удзельнікаў, то ў апошнім мерапрыемстве, якое прайшло ў Нур-Султане, прынялі ўдзел ужо 65 парламентаў і 14 міжнародных арганізацый.

Мы завастрылі ўвагу сваіх калег на новай стратэгічнай ініцыятыве кіраўніка беларускай дзяржавы аб фарміраванні «пояса лічбавага добрасуседства». Яна лагічна вынікае з ідэі «Хельсінкі 2» і ў плане абароны ад сучасных пагроз чалавецтву можа сыграць не менш важную ролю, чым Дагавор аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі.

Нашы прапановы ўвайшлі ў выніковы дакумент Нарады. Гэта сведчыць аб значнасці пытанняў, якія падымае Рэспубліка Беларусь на міжнароднай арэне. Пацвярджэнне таго мы пачулі і на сустрэчы са старшынёй Міжпарламенцкага саюза спадарыняй Баран, якая наведала нашу краіну для ўдзелу ў міжнароднай канферэнцыі высокага ўзроўню, прысвечанай барацьбе з тэрарызмам пры дапамозе сучасных тэхналогій і інавацый.

Нам вельмі блізкія і зразумелыя мэты, вакол якіх будуецца дзейнасць гэтай глабальнай парламенцкай арганізацыі. Фактычна менавіта прыярытэты ўстойлівага развіцця вызначаюць як унутраную, так і знешнюю палітыку Беларусі. І мы глыбока перакананыя, што самым верным крокам да больш стабільнага, бяспечнага і справядлівага свету з'яўляецца не канкурэнцыя, а актыўны пошук пунктаў спалучэння паміж рознымі эканамічнымі мадэлямі, што існуюць у свеце.

Для Беларусі натуральным шляхам развіцця заўсёды была і застаецца плённая інтэграцыя з усімі, хто гатовы з намі супрацоўнічаць, перш за ўсё з найбольш блізкімі суседзямі. Пры гэтым мы разумеем, што інтэграцыя не самамэта, а інструмент дасягнення найвышэйшай мэты — росту дабрабыту грамадзян нашых краін.

На гэтых прынцыпах мы будуем сваю работу ў парламенцкіх вымярэннях СНД, АДКБ, Саюзнай дзяржавы. У нашых агульных інтарэсах максімальна задзейнічаць увесь інтэграцыйны патэнцыял, які мы маем. Таму асаблівы ўпор робіцца на гарманізацыі заканадаўства, забеспячэнні роўных правоў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання, навядзенні парадку ў гандлёва-эканамічных адносінах.

Зразумела, тэмай многіх маючых адбыцца міжнародных мерапрыемстваў стануць парламенцкія выбары. Яны ўжо, дарэчы, абмяркоўваліся ў Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях і дэмакратыі, а таксама на сустрэчы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з місіяй па ацэнцы патрэб БДІПЧ АБСЕ.

Па меры набліжэння даты выбараў у краіне павялічыцца колькасць міжнародных назіральнікаў. Частка з іх запрошана па нашай ініцыятыве. З імі нам таксама трэба будзе сустракацца. І, вядома, беларускія дэпутаты пастараюцца аказаць ім усё магчымае садзейнічанне для выканання іх місіі.

Нам няма чаго хаваць. Усе бачаць, што выбарчая кампанія праходзіць цывілізавана і канструктыўна. Гэта сведчыць пра высокі ўзровень палітычнай культуры беларускага грамадства і разуменні ім важнасці захавання сацыяльнай стабільнасці і грамадзянскага міру.

Для паспяховага развіцця любой дзяржавы важныя згуртаванасць усіх грамадзян незалежна ад узросту, поглядаў і перакананняў, нацэленасць на эфектыўнае супрацоўніцтва. Гэта сфера адказнасці і дэпутацкага корпусу.

Нам неабходна падтрымліваць пастаянны дыялог з грамадствам. Грамадзяне павінны ведаць, што стаіць за найважнейшымі дзяржаўнымі рашэннямі, як аджыццяўляецца заканадаўчы працэс, якімі якасцямі павінны валодаць дэпутаты, каб годна прадстаўляць інтарэсы народа ў заканадаўчым органе.

Вялікую ролю тут іграе выкананне нашых абавязкаў у выбарчых акругах. Дробных пытанняў у гэтай рабоце, як мы ведаем, няма. І ад іх рашэння шмат у чым залежыць давер народа да ўлады. Парламентарыі заўсёды былі сілай, якая кансалідуе грамадства ў адказныя для краіны перыяды развіцця. Упэўнены, так будзе і надалей.

На заканчэнне, паважаныя калегі, дазвольце мне падзякаваць вам за падрыхтоўку да сесіі і запрасіць да работы.

Парламенцкі дзённік

# НОВЫЯ ЛЕКІ СТАНУЦЬ БОЛЬШ ДАСТУПНЫЯ

**Норма, якая дазволіць выкарыстоўваць арыгінальныя лекавыя сродкі да завяршэння клінічных выпрабаванняў, прапісана ў законапраекце, які ўчора разглядалі ў Палаце прадстаўнікоў.**

Магчымасць умоўнай рэгістрацыі лекаў тэрмінам на адзін год прапануецца для высокаэфектыўных новых прэпаратаў для лячэння цяжкіх і рэдкіх хвароб. Такая практыка прымяняецца ў многіх краінах. Яе ўвядзенне ў нашай краіне абмяркоўваецца ў парламенце Беларусі. Новая норма прапісана ў праекце змяненняў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб лекавых сродках», які быў учора прыняты ніжняй палатай у першым чытанні.

На думку **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры і маладзёжнай палітыцы Аляксандра СТАРАВОЙТАВА,** законапраект аблегчыць даступнасць лекаў, якія толькі ўводзяцца на рынак.

Дзеючы закон працуе з 2006 года. «Новаўвядзенні трактуюцца як новая рэдакцыя закона, — пракаментаваў ён дакумент журналістам. — Унясенне змяненняў звязана з гарманізацыяй нашага заканадаўства ўнутры ЕАЭС. Акрамя таго, улічваючы планы Беларусі па ўступленні ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, і ў выніку Пагаднення па гандлёвых аспектах правоў інтэлектуальнай уласнасці (TRIPS) у законапраекце прадугледжана абарона інтэлектуальнай уласнасці на арыгінальныя прэпараты на чатыры і два гады».

Да таго ж, праект закона замацоўвае існуючую (але дагэтуль не прапісаную) практыку продажу ўрачамі альбо фельчарамі лекаў сельскім жыхарам там, дзе няма аптэк.

**Дэпутат ад Жыткавіцкай акругі Ірына КРАЛЕВІЧ** спытала міністра аховы здароўя, які прадстаўляў законапраект у Авальнай зале Палаты прадстаўнікоў, ці не пацягне стварэнне адзінага рынку лекаў на тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза паслаблення кантролю за іх абаротам у Беларусі.

«Стварэнне адзінага рынку мае на ўвазе стварэнне і адзінага рэестра. Да таго ж, рэгістрацыя па Пратаколе ЕАЭС прадугледжвае паведамленне ўсім краінам-членам аб рэгістрацыі і яе абгрунтаванні. Акрамя таго, кожная партыя любога прэпарата, які трапляе ў краіну, падлягае ўваходнаму кантролю, — адказаў Уладзімір Каранік. — Гэта сістэма дзейнічае 15 гадоў, і не было зарэгістравана ніводнага выпадку ўвозу фальсіфікаваных лекавых сродкаў».

Апроч сказанага, міністэрства прапрацоўвае сістэму дадатковага кантролю за якасцю лекаў у выглядзе фармінспекцыі, якая будзе вымаць з аптэк і бальніц прэпараты і накіроўваць іх у сертыфікацыйную лабараторыю без указання вытворцы. Такім чынам, у выніку рэдакцыі дзеючага закона, кантроль за якасцю лекаў у краіне не будзе аслаблены, запэўніў міністр.

Адказваючы на пытанні журналістаў аб тым, чаму ў беларускіх аптэках знікаюць тыя або іншыя прэпараты, кіраўнік міністэрства растлумачыў: так адбываецца з-за таго, што фірмы не праводзяць паўторную рэгістрацыю лекаў, у якіх яны не зацікаўленыя. «Згодна з законапраектам, калі прэпарат зарэгістраваны, пяць гадоў прымяняецца ў нас і іншых краінах свету, праходзіць працэдуру перарэгістрацыі, то ўжо наступнае рэгістрацыйнае пасведчанне даецца бестэрміновa», — дадаў ён.

Уладзімір Каранік паведаміў, што міністэрства прааналізавала ўсе прэпараты, у якіх налета завяршаецца рэгістрацыя (такіх больш за 900). «Мы практычна па ўсіх гэтых пазіцыях прапрацавалі: нехта пацвердзіў паўторную рэгістрацыю, некага прыйшлося ўзмоцнена запрасіць на паўторную рэгістрацыю, недзе вырашаем пытанне замены пастаўшчыка, каб гэтыя прэпараты засталіся на рынку», — расказаў міністр.

Усяго ў першы дзень работы восеньскай, апошняй, сесіі Палаты прадстаўнікоў шостага склікання дэпутаты разгледзелі чатыры законапраекты ў першым чытанні, тры — у другім і ратыфікавалі сем міжнародных дакументаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Блізкая ўлада

# Вырашаць пытанні комплексна



**Праблемы сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, безбар'ернае асяроддзе, выраб інвалідных калясак — галоўныя тэмы падчас прыёму грамадзян намеснікам прэм'ер-міністра Уладзімірам КУХАРАВЫМ у Савеце Міністраў.**

Маці, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, звярнуліся да віцэ-прэм'ера па цэлым шэрагу пытанняў. Адно з самых актуальных — жыллё. Адна з наведвальніц узняла пытанне паляпшэння жыллёвых умоў. Паводле яе слоў, у яе сям'і трое дзяцей, адно з якіх інвалід. Па нормах яму належыць асобны пакой. Пры гэтым сям'я жыве ў двухпакаёвай кватэры ў Мінску і не можа стаць на чаргу па паляпшэнні жыллёвых умоў, бо для гэтага метраж на чалавека ў сталіцы не павінен перавышаць 10 кв. м (у рэгіёнах — 15 кв. м). Уладзімір Кухараў даручыў прааналізаваць усе нюансы і адпрацаваць магчымасць урэгулявання гэтага пытання. Праблема ўзятая на кантроль. «Калі ўбачым, што трэба вырашаць гэтае пытанне, будзем выходзіць з адпаведнымі заканадаўчымі ініцыятывамі. Праблемы сем'яў з дзецьмі-інвалідамі трэба вырашаць комплексна», — падкрэсліў ён.

Яшчэ адно важнае пытанне — забеспячэнне безбар'ернага асяроддзя, у тым ліку планіроўка кватэр для інвалідаў. Адна з маці адзначыла, што ў кватэры вельмі складана перамяшчаць і паварочваць інвалідную каляску. Віцэ-прэм'ер звярнуў увагу, што ў Беларусі ёсць кватэры, у планіроўцы якіх улічваюцца патрэбы гэтай катэгорыі людзей, у прыватнасці пашыраны дзвярныя праёмы. «Спецыяльныя праекты распрацаваны, трэба толькі адрэгуляваць гэтае пытанне. Міністэрству працы і сацыяльнай абароны трэба ўзяць праблему пад сваю эгіду і фарміраваць сацыяльны заказ. Тады выканкам будзе ведаць, колькі кватэр для сем'яў з інвалідамі трэба пабудаваць у раёне», — дадаў ён.

Некалькі маці ўзнялі праблему вырабу інвалідных калясак, тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, пашыву артапедычнага абутку. Па іх словах, мадэль каляскі нярэдка не адпавядае патрэбам канкрэтнага дзіцяці-інваліда, а пры пашыве абутку — вялікія чэргі і заказ трэба чакаць некалькі месяцаў. Уладзімір Кухараў даручыў прапрацаваць пытанне ўдасканалення мадыфікацый інвалідных калясак і падкрэсліў, што вытворцу варта ў першую чаргу ўлічваць меркаванні людзей, якія карыстаюцца такімі сродкамі. Ён таксама даў даручэнне ўрэгуляваць пытанні пашыву артапедычнага абутку.

Актуальнай праблемай з'яўляецца недахоп сацыяльных таксі. У сувязі з гэтым запісвацца трэба задоўга да запланаванай паездкі, што стварае цяжкасці для сем'яў з інвалідамі. Віцэ-прэм'ер адзначыў неабходнасць папаўнення аўтапарка. «Сацыяльныя таксі запатрабаваныя, яны патрэбныя многім сем'ям, і мы павінны працягваць работу ў гэтым кірунку», — сказаў ён.

Акрамя таго, на сустрэчы былі выказаны прапановы зрабіць больш свабодным графік работы сацыяльных няняў — не строга чатыры гадзіны ў дзень, як цяпер, а па дамоўленасці паміж сям'ёй і нянай. Віцэ-прэм'ер падтрымаў прапанову і даручыў прапрацаваць магчымасць вырашэння пытання.

Да Уладзіміра Кухарава на прыёме звярталіся ў тым ліку і з нагоды паляпшэння жыллёвых умоў, жыллёва-камунальных паслуг, ліцэнзавання ў транспартнай сферы.

# ІДЭАЛЬНЫЯ БАЦЬКІ. А ТАКОЕ БЫВАЕ?

**На працягу кастрычніка ва універсітэце адбудуцца чатыры тэматычныя тыдні: «Старэйшых» бацькоў», «Маці», «Бацькі» і «Будучых бацькоў». Праграма складаецца з розных па фармаце і жанры падзей. Гэта выстаўкі, лекцыйныя і практычныя заняткі, семінары, трэнінгі, псіхалагічныя кансультацыі...**

Падчас першага тыдня пройдуць акцыі «Ліст дадому» і «Дзякуем». Удзельнікі напішуць і адправяць папяровыя лісты сваім сем'ям. Таксама сувязям пакаленняў і радаводу будуць прысвечаны семінарскія заняткі «Сістэма сямейных каштоўнасцяў як падмурак для маладога пакалення» і трансфармацыйная гульня «Энергія роду».

У рамках «Тыдня маці» ў псіхалагічнай гасцінай пройдуць дыскусіі і заняткі з выкарыстаннем метафарычных картаў па тэмах «Вобраз маці і жаночыя архетыпы», «Дзяцінства ад нас не сыходзіць... Дзяцінства жыве ў нас заўсёды», «Мама — ты мой лёс». Усе ахвотныя змогуць прайсці экспрэс-дыягностыку «Гатоўнасць да сямейнага жыцця».

«Тыдзень бацькі» адкрыецца мастацкай выстаўкай «Вобраз бацькі ў мастацтве». У гэтыя дні адбудзецца таксама сацыяльная акцыя «Тата можа. Я дапамагу» і прагляд фільма «У пагоні за шчасцем».

## «Бацькоўскі месяц» стартаваў у БДУ

Завершыць тэматычны месяц «Тыдзень будучых бацькоў». Яго праграма прапануе ўдзел у семінарскіх і практычных занятках са спецыялістамі псіхалагічнай службы БДУ і сацыяльнымі педагогамі. На практыкуме «Ролевыя чаканні ў шлюбе» аб сваім сямейным вопыце раскажуць маладыя сем'і студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ. А ў рамках акцыі «Будучым бацькам» студэнты намалююць вобразы ідэальных бацькоў. На працягу ўсяго месяца спецыялісты «Кансультацыйнага цэнтра» будуць аказваць прафесійную дапамогу па пытаннях узаемаадносін пакаленняў, маладых мужа і жонкі з бацькамі, сямейных адносін і іншых.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Трамп назваў запушчаны дэмакратамі імпічмент дзяржпераваротам

«Я прыходжу да высновы, што тое, што адбываецца, — не імпічмент, а дзяржпераварот», — напісаў Дональд Трамп у Twitter. Паводле яго слоў, усё гэта робіцца, каб забраць галасы людзей, іх волю, рэлігію, армію, сцяну на мяжы і іх правы грамадзян Злучаных Штатаў.

Раней Трамп выступіў з відэазваротам у сувязі з сітуацыяй вакол імпічменту, у якім заявіў, што дзеянні Дэмакратычнай партыі з'яўляюцца «велізарным падманам».

25 верасня старшыня Палаты прадстаўнікоў дэмакрат Нэнсі Пэласі аб'явіла аб пачатку працэдуры імпічменту Трампу і дала ўказанне шасці камітэтам ніжняй палаты Кангрэса пачаць расследаванне яго дзеянняў. Падставай для гэтага сталі ўцечкі ў СМІ, звязаныя з размовай лідара ЗША з украінскім калегам Уладзімірам Зяленскім.

Белы дом вырашыў апублікаваць расшыфроўку тэлефоннай размовы Трампа і Зяленскага, якая пацвердзіла, што прэзідэнт ЗША папрасіў украінскага калегу вывучыць сітуацыю з Байдэнам. Пры гэтым пытанне ваеннай дапамогі Украіне, пра якое пісалі СМІ, у гутарцы не згадвалася.

### У былым канцлагеры Бухенвальд пачаўся пошук нацысцкіх тунэляў з нарабаванымі каштоўнасцямі

На тэрыторыі мемарыяльнага комплексу Бухенвальд 1 кастрычніка пачаліся пошукі тунэляў, выкапаных зняволенымі вясной 1945 года па загадзе СС, паведамляе нямецкая медыякампанія MDR.

Два такія ўзарваныя тунэлі, якія выкарыстоўваліся нацыстамі для захоўвання нарабаваных каштоўнасцяў, былі знойдзены ўвесну 1945 года амерыканскімі ваеннымі. Для вывазу каштоўнасцяў амерыканцам спатрэбілася дзевяць грузавікоў, паведамляе MDR.

У апошнія гады ўсё больш экспертаў падазраюць, што такіх узарваных тунэляў у прылеглым да лагера раёне каменяломняў магло быць больш. На апублікаваным у 1990-я гады плане падзямелляў пазначаны восем невядомых бункераў. Некаторыя не выключаюць, што ў адным з іх можа захоўвацца і знакаміты «Янтарны пакой». Раскопкі пачаліся ў двух месцах, дзе летась пад тоўшчай зямлі былі выяўлены полыя прасторы.

### Памёр спявак Карэл Гот



Славуты спявак Карэл Гот, якога ў многіх краінах свету называлі «чэшскім салаўём», памёр у ноч на сераду ў сваім доме ў Празе ва ўзросце 80 гадоў, паведаміла журналістам яго прэс-сакратар Анета Штольцава.

У пачатку верасня Гот апошні раз пагутарыў з журналістамі, расказаўшы, што ўрачы дыягнаставалі ў яго вострую лейкемію і што ён пачынае амбулаторнае лячэнне.

У лістападзе 2015 года ў спевака была выяўлена пухліна лімфатычных вузлоў. Пасля сур'ёзнага гадавога лячэння ён неаднаразова спрабаваў вярнуцца да эстраднай дзейнасці, некалькі разоў выступаў з невялікімі канцэртамі ў суправаджэнні іншых чэшскіх спевакоў. У ліпені гэтага года Гот адзначыў сваё 80-годдзе, але юбілейны канцэрт, як і шэраг канцэртаў раней, быў адменены ў сувязі з дрэнным станам здароўя артыста.

Па звестках мясцовых СМІ, Карэл Гот, нароўні з хакеістам Ярамірам Яграм, з'яўляўся самым папулярным грамадзянінам Чэхіі. У свеце было прададзена больш за 30 мільёнаў копій яго дыскаў. У артыста падрастаюць дзве дачкі, сёлета ім спаўняецца 13 і 11 гадоў.

**Уважаемые акционеры ОАО «Красный Октябрь»!**

30 сентября 2019 г. внеочередным собранием акционеров принято решение о реорганизации Открытого акционерного общества «Красный Октябрь» (210026, г. Витебск, пр-т Генерала Людникова, д. 10) в форме присоединения к нему Производственного унитарного предприятия «Сан Марко».

В соответствии со ст. 78 Закона Республики Беларусь от 09.12.1992 № 2020-XII «О хозяйственных обществах» у акционеров, которые голосовали против принятия данного решения или не были надлежащим образом извещены о проведении общего собрания акционеров, наступает право требовать выкупа принадлежащих им акций ОАО «Красный Октябрь».

Акции Открытого акционерного общества «Красный Октябрь», выкупленные по требованию его акционеров, подлежат аннулированию.

Цена выкупа одной простой (обыкновенной) акции ОАО «Красный Октябрь» утверждена общим собранием акционеров и составляет 0,01 белорусского рубля.

Оплата приобретенных акций – не позднее 30 календарных дней после совершения сделки в безналичном порядке на вкладные счета и карт-счета.

Оформление сделок купли-продажи акций будет производиться в ОАО «АСБ Беларусбанк» (210015, г. Витебск, ул. Смоленская, 9а, каб. 1.5). Оплата услуг профессионального участника рынка ценных бумаг осуществляется за счет акционера.

Акционерам, желающим продать акции обществу, необходимо обратиться в срок с 30 сентября 2019 г. по 18 ноября 2019 г. с письменным требованием о выкупе принадлежащих им акций по адресу: Республика Беларусь, 210026, г. Витебск, пр-т Генерала Людникова, д. 10 в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 13.30 до 17.00.

Контактный телефон для справок: 8-0212-52-55-70.

Письменное требование акционера о выкупе принадлежащих ему акций должно содержать фамилию, имя и отчество (наименование) и подпись акционера, а также количество акций, выкупа которых он требует.

Приобретение акций у акционеров будет осуществляться с 19 ноября 2019 г. по 18 декабря 2019 г.

**Директор ОАО «Красный Октябрь»**

УНП 300003144

Камунальныя стасункі

# Важней за ўсё — надвор'е ў доме

## У сталічных кватэрах — за 30 градусаў, а ў Брэсце і Гомелі пакуль батарэі халодныя

**Бальніцы, школы, музеі і архівы ўсёй краіны ўжо абаграваюцца. Рашэнне аб падключэнні ў гэтых установах ацяплення афіцыйна з 23 верасня прынялі ўсе аблвыканкамы і сталічны выканаўчы камітэт. Даваць цяпло ў жыллё вырашылі таксама амаль ва ўсёй краіне, за выключэннем Гомельскай вобласці, самай паўднёвай. Улады Брэстчыны рашэнне прынялі, аднак батарэі награваць не спяшаюцца, бо на вуліцы досыць цёпла. Не атрымалі цяпло таксама дамы ў Дзяржынскім і Салігорскім раёнах.**

### Рэжым прапальвання

Для бяспекі работ створаны аварыйныя брыгады, у якіх больш як 400 чалавек. Над наладкай сістэмы ацяплення працуе звыш 1000 рабочых і каля 500 майстроў.

За вокнамі вышэй за 11 градусаў, а ацяпленне можа працаваць стабільна, калі знадворку не больш як +8 °С. Калі ж тэмпература на вуліцы вышэйшая за восем градусаў, то дамы павінны знаходзіцца ў рэжыме прапальвання, заўважыў **Цімафей КРЭМЕЗ, намеснік генеральнага дырэктара «Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі»**:

— Тэхнічна рэжыму прапальвання не існуе, мы яго прыдумалі. Заўважу, што па гідраўлічных параметрах тэмпература вады, што падаецца на дом з цеплакрыніцы, — 35 °С. Гэта лічба крыху ніжэй за тэмпературу цела, і многім грамадзянам, асабліва пажылым, здаецца, што іх батарэі цяпер халодныя. У выніку ўзнікаюць скаргі на адсутнасць ацяплення.

Спецыяліст спадзяецца, што сітуацыя выправіцца да выхадных, бо абяцанае пахаладанне дазволіць аб'ектыўна высветліць, ці існуюць у кватэрах пэўныя праблемы з трубамі, накшталт запаветрывання, або сапраўды адсутнічае ацяпленне.

Тым жа, у чыіх кватэрах цяпер надта горача, а некаторыя мінчане сведчаць, што слупкі іх тэрмометраў перасягнулі 30 °С, Цімафей Крэмез раіць паведамляць аб праблеме ў свае ЖЭУ або кантакт-цэнтры.

— Трэба, каб спецыялісты маглі своечасова прымаць пэўныя рашэнні. У тым ліку і адносна часовага прыпынення падачы цяпла на дом, калі днём ацяпленне ў жыллі адключаюць, а ўвечары аднаўляюць, — упэўнены ён.

Учарашнія аператыўныя лічбы сведчаць, што 89 % жылля ў Беларусі ацяпляецца. У Мінску і Віцебскай вобласці грэюцца ўжо ўсе. На Магілёўшчыне цёпла ў 98 % дамоў, у сталічнай вобласці пацяплела ў 73 % жылля, у Гродзенскай — у 69 %. Пра гэта паведаміла **Святлана ЦІМОШКІНА, намеснік начальніка ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства ЖКГ.** Падключэнне ацяплення ў сталічных адміністрацыйных будынках пакуль разглядаецца.

### Да зімы гатовыя

Падрыхтоўку да ацяпляльнага сезона камунальнікі пачынаюць у маі і завяршаюць 30 верасня. Сёлета ўпершыню тры аблвыканкамы адрапартавалі, што справіліся з падрыхтоўчымі работамі яшчэ да 1 верасня. А на пачатку кастрычніка ў краіне ўжо поўнасцю нарыхтаваны запасы драўнянага паліва, неабходнага на зіму. У больш чым 3,5 тысячы кацельных выкананы прафілактычныя работы. Гатовы да зімоўкі больш за 15 тысяч кіламетраў цепласетак гаспадаркі і ўсе дамы.

Кантралюецца падрыхтоўка да зімы па 89 паказчыках штомесяц, і па 13 — кожны тыдзень. У верасні адбываецца праверка пашпартоў гатоўнасці, якія ўжо атрымалі ўсе цеплакрыніцы і спажыўцы цеплаэнергіі краіны.

Усе асноўныя запланаваныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да зімы ў сталіцы выкананы. Поўнасцю адрамантаваны стыкі сценавых панэляў, дахі, фасады, праведзены прафілактычныя работы па падрыхтоўцы інжынернага абсталявання для бяспечнай эксплуатацыі ў сезон ацяплення, запэўнілі камунальнікі. Выключэнне толькі для работ, якія прадугледжаны на 2020-ы: рамонт цеплавых, водаправодных і каналізацыйных сетак.

— Зімою ратаваць сталіцу ад снегу будуць 700 адзінак спецтэхнікі, а 800 прыбіральшчыкаў — расчышчаць прыпынкі, тратуары, лесвіцы і пешаходныя пераходы, — праінфармаваў **Алег ЛУКАШЭНКА, намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання «Гарамаўтадар Мінгарвыканкама» па ўтрыманні аб'ектаў добраўпарадкавання.** — Апрацоўваць мінскія дарогі будуць пясчана-саляной сумессю і чыстай соллю «Галіт» маркі А. Да 15 кастрычніка іх нарыхтоўць у неабходнай колькасці — не менш як 75 % ад патрэбнай прадпрыемствам. 7,9 тысячы тон сумесі — аб'ём, які могуць умясціць склады, папаўняцца запасы будуць па меры расходавання.

**Ірына СІДАРОК.**

# ПАЛАМАНЫЯ ЛЁСАМ, АЛЕ НЕ ЗЛАМАНЫЯ

## Адкрыўся цэнтр дапамогі ахвярам ДТЗ, якія знаходзяцца ў вегетатыўным стане

**Штогод у дарожна-транспартных здарэннях траўмуецца каля 3,5 тысячы чалавек, больш за паўтысячы — гіне, каля дзвюх тысяч чалавек прызнаюць інвалідамі. З іх тры працэнты знаходзяцца ў даволі цяжкім, вегетатыўным стане. Для такіх людзей на базе Рэспубліканскага клінічнага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны імя П. М. Машэрава ў аграгарадку Лясны Мінскага раёна адкрыўся Цэнтр дапамогі ахвярам ДТЗ. У Беларусі такіх людзей, якія пасля аўтамабільных аварый знаходзяцца ў вегетатыўным стане, некалькі дзясяткаў. У кожнага — свая гісторыя, якая ў секунды пераварнула не толькі іх жыццё, але і жыццё блізкіх.**



...40-гадовы Аляксандр Бурачкоў трапіў у ДТЗ па віне п'янага кіроўцы. Саша быў пасажырам на заднім сядзенні, калі ў іх аўтамабіль уехала машына, якая выйшла з-пад кантролю. Гэта здарылася ў чэрвені 2017-га. Урачы не давалі пацыенту ніякіх шанцаў — траўмы, сярод якіх цяжкая адкрытая чэрапна-мазгавая, пазбаўлялі надзеі нават аптымістаў, якія сваімі рукамі выцягнулі з таго свету не аднаго траўмаванага. Але Саша не толькі выжыў, але і паступова пачаў выходзіць з вегетатыўнага стану.

Сёння ён жыве ў вёсцы Вялікае Сяло Дзяржынскага раёна. Дзякуючы сястры Жанне, цётцы і яе мужу, якія на гэты час сталі самымі блізкімі людзьмі, паступова яго стан мяняецца да лепшага.

— Калі спачатку зваротнай сувязі не было ўвогуле, то сёння Аляксандр рэагуе на тэлевізар, глядзіць відэа ў інтэрнэце, і яго стан ужо нават можна лічыць не вегетатыўным, — кажа Аксана Гутарава, лечачы ўрач.

— Пытаеш, як справы, — і ён паднімае ўверх вялікі палец, — дадае сястра Жанна. — Раней у яго стаяла трахеастома, цяпер у ёй няма патрэбы. Засталася гідрастома, але Саша ўжо навучыўся есці праз рот, спадзяюся, з часам знімуць і яе. Ён вялікі малайчына, бо змагаецца за жыццё. Хоць усе мы разумеем, што працэс аднаўлення вельмі доўгі.

У цэнтр дапамогі ахвярам ДТЗ, а да гэтага ў паліятыўнае аддзяленне шпіталя інвалідаў ВАВ Аляксандр трапляе не першы раз. Тут распрацоўваецца пэўная праграма рэабілітацыі, урачы кожны раз ставяць новую мэту і імкнуцца дасягнуць яе. Зараз, напрыклад, пацыент знаходзіцца на вертыкалізатары — прыстасаванні, незамянімым для ляжачых хворых. Яно дазваляе прывесці цела ў вертыкальнае становішча, што паляпшае кровазабеспячэнне і функцыянаванне ўсіх органаў і сістэм. Даюць пацыентам і заданні на дом, а таксама навучаюць блізкіх, як дапамагаць хвораму рабіць зарадку, масаж, апрацоўку трахеастомы ці іншых прылад.

— Раней такі чалавек быў адсунуты на другі план, мог разлічваць толькі на догляд блізкіх і дапамогу сацыяльных службаў. Сёння мы гэту сітуацыю імкнёмся мяняць, — расказвае **галоўны ўрач Рэспубліканскага клінічнага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны імя П. М. Машэрава Віктар ЛІШАКОЎ.** — Працуем са сваякамі, вучым іх прыёмам догляду. Напрыклад, бацька Максіма Максімава сёння дасць фору некаторым медыцынскім работнікам. За тры гады ён навучыўся ўсяму: як правільна пераварочваць, карміць, апранаць.

32-гадовы Максім Максімаў — гонар медыцынскага персаналу цэнтра. Калі тры гады таму ён не рэагаваў ні на што, то цяпер яго апошняе дасягненне — 12 кіламетраў на велатрэнажоры. У 2016-м Максім уваходзіў у зборную па каратэ і вяртаўся з чэмпіянату Еўропы, які праходзіў у Польшчы. Той раніцай прымарозіла і пайшоў дожджык, машыну са спартсменамі, якая выязджала з другаснай дарогі, панесла на слізкім пакрыцці проста пад «газель». У аварыі адзін з хлопцаў загінуў, Максім тры месяцы правёў у штучнай коме, перанёс 16 аперацый і тры трэпанацыі чэрапа і аднаўляецца дагэтуль. Яго бацька Валерый Віктаравіч два гады таму звольніўся з работы і ўвесь час прысвячае аднаўленню сына, які сёння рэагуе на навакольных, усміхаецца жартам, самастойна можа сядзець у крэсле і нават імкнецца размаўляць.

— На перыферыі да такіх, як мы, урачы ставяцца з асцярогай, ды і не ведаюць, што з намі рабіць. Цэнтр для нас — сапраўднае выратаванне, — кажа Валерый Віктаравіч.



Як тлумачаць медыкі, у нашай мазгавой дзейнасці ўдзельнічае ўсяго 30 працэнтаў клетак, астатнія папросту «спяць». Разбудзіць іх з дапамогай сучасных методык, у прыватнасці электрамагнітнай стымуляцыі галаўнога мозга, і прымусіць працаваць замест страчаных падчас чэрапна-мазгавой траўмы — вялікая надзея для такіх пацыентаў. А вось на пытанне, ці магчымае поўнае іх аднаўленне, урачы не даюць адназначных адказаў: усё індывідуальна. І прыводзяць прыклад вядомага акцёра Мікалая Карачанцава, у аднаўленне якога пасля цяжкага ДТЗ было ўкладзена шмат сродкаў і намаганняў. Аднак да паўнацэннага жыцця ён так і не вярнуўся.

Цэнтр дапамогі ахвярам ДТЗ запрацаваў дзякуючы старанням фонду «Бяспечныя дарогі», Міністэрства транспарту і камунікацый і Міністэрства аховы здароўя. Ён адкрыты на сродкі спонсараў — прыватных кампаній і ахвярадаўцаў. У прыватнасці, дабрачынны фонд «Бяспечныя дарогі» інвеставаў больш за 250 тысяч еўра. А пачыналася гэта ініцыятыва яшчэ ў кастрычніку 2016 года падчас візіту ў Беларусь яго Каралеўскай Высокасці прынца Майкла Кенцкага. Тады ён разам з міністрам транспарту і камунікацый падпісаў мемарандум «Аб узаемаразуменні па пытаннях далейшага развіцця дарожнай бяспекі ў Рэспубліцы Беларусь». У дакуменце, апроч іншага, ішла размова аб стварэнні дабрачыннага фонду ў галіне дарожнай бяспекі.

— У будынку, якому 40 гадоў, складана адкрыць сучасны медыцынскі цэнтр. Мы ўклалі вялікія сродкі ў рамонт памяшканняў, закупілі сучаснае абсталяванне, у прыватнасці функцыянальныя ложкі, і стварылі адно з найлепшых паліятыўных аддзяленняў у краіне, дзе маюцца ўсе ўмовы як для хворага, так і для яго блізкіх, якія тут могуць знаходзіцца кругласутачна, — кажа Віктар Лішакоў.

Размяшчаецца цэнтр у асобным корпусе шпіталя інвалідаў вайны. Пакуль тут усяго шэсць палат, але ў кожнай з іх створаны ўмовы для таго, каб блізкія маглі знаходзіцца побач з пацыентам 24 гадзіны ў суткі. Усе палаты добра аснашчаныя як медыцынскім абсталяваннем, так і з бытавога пункту погляду: ёсць кандыцыянеры, умывальнік, кнопкі экстраннага выкліку, канапа-ложак для блізкіх, вядзецца відэаназіранне. Пацыенты тут знаходзяцца не круглы год, а прыязджаюць перыядычна для паглыбленага абследавання і рэабілітацыі.

— Такія цэнтры патрэбны, каб аблягчыць пакуты пацыента і яго блізкіх, забяспечыць якасную медыцынскую дапамогу, псіхалагічную падтрымку блізкім, а таксама навучыць іх доглядаць такога чалавека. Магчымасць для іх перыядычна прыязджаць у цэнтр для абследавання і рэабілітацыі дазволіць зняць вастрыню праблемы, — падкрэсліў **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК.** — Шэсць палат — толькі пачатак. Гэта будзе базавая ўстанова з самымі сучаснымі методыкамі, на прыкладзе якой мы плануем распаўсюдзіць такі вопыт на рэгіёны.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота БелТА.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
3 КАСТРЫЧНІКА 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 17 (15872)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Дзмітрый ФРЫГА: «САМАЕ ДЗЁРЗКАЕ ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ»



**Вы любіце кіно? А тэатр? А рэкламу? А ці ведаеце, чыя музыка не выходзіць з вашай галавы пасля спектакля? А чыю мелодыю напяваеце пасля фільма? Задумваліся, хто прыдумаў тыя акорды, па якіх без запінкі адгадваецца ўлюбёны брэнд? Не ведаеце? А вось кампазітар Дзмітрый Фрыга дакладна ведае, хто стварыў саўндтрэкі да кінакарцін «Вышэй за неба», «ГараШ», «PARTY-ZAN фільм», хто аздобіў гукам Тэатр беларускай драматургіі, хто напісаў ноты да любімых (ці наадварот?) рэкламных ролікаў. Здагадваецеся, чаму?**

***— Многія прызнаюцца, што сталі музыкантамі дзякуючы бацькам: яны першымі заўважылі талент і, часам насуперак дзіцячаму жаданню, прывялі ў музычную школу. Ваша гісторыя мае падобны пачатак?***

— Магчыма, я вас здзіўлю: мае бацькі ніколі не хацелі, каб я вучыўся ў музычнай школе. Памятаю, тата быў нават супраць: куды, маўляў, нам гэтае фартэпіяна. Але я настойваў... З ранніх гадоў адчуваў, што павінен займацца творчасцю. Маленькім я проста абажаў чытаць вершы і спяваць. Таму вучоба ў музычнай школе, а пазней у Брэсцкім музычным каледжы імя Р. Шырмы і ў БДПУ імя М. Танка на музычным аддзяленні трымалася выключна на маім жаданні. Быў, праўда, момант, калі ў сярэдніх класах я апынуўся перад выбарам: музыка або інфарматыка. Але, як бачыце, мастацтва ўзяло верх.

***— Капіраванне чужых прыёмаў лічыцца натуральным этапам станаўлення творцы. А вам, пачаткоўцу, на каго хацелася быць падобным?***

— Ужо падчас навучання ў каледжы, калі я пачаў паглыблена вывучаць гісторыю музыкі, калі сутыкнуўся з прафесійным аналізам твораў, калі асэнсаваў, як развіваецца музычнае мастацтва, сярод безлічы майстроў вылучыліся асобы, якія сталі маімі арыенцірамі. Я адкрыў іх для сябе ўжо не проста як слухач, але як прафесіянал. У акадэмічнай музыцы гэта Людвіг ван Бетховен і Сяргей Пракоф'еў. А ўлюбёныя прадстаўнікі папулярнай музыкі — гурты Queen і The Beatles. Я захапляюся іх упартасцю, працаздольнасцю, смеласцю перад новым і рызыкоўным. Іх пераадоленне трывіяльнасці і самакапіравання мяне натхняе.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Нечакана!

# МУЖЧЫНСКІЯ РУКІ ДЛЯ... ЖАНОЧЫХ БРОВАК

**Фёдар ЕЎДАКІМАЎ — уладальнік сталічнай студыі прыгажосці, якая вылучаецца сярод іншых тым, што ў ёй у якасці майстроў працуюць толькі хлопцы. Гэта сумесны праект нашага суразмоўніка з жонкай Надзеяй, якім яны пачалі займацца тры гады таму. Пра паспяховае вядзенне бізнесу, цяжкасці з падборам каманды і сучасныя тэндэнцыі пара расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене».**

***— Калі вас упершыню зацікавіла сфера прыгажосці?***

**Фёдар:** — Аднойчы да жонкі прыйшла сяброўка, каб нарасціць ёй вейкі. Мяне заваражыў працэс, і я папрасіў у Надзі дазволу паспрабаваць самому. Думаў, што гэта вельмі проста, але задача аказалася для мяне непасільнай. Тады пачаў вывучаць усё больш падрабязна, цікавіцца актуальнымі формамі і тэхнікамі. Сумяшчаў хобі з асноўнай работай — днём займаўся распрацоўкай вонкавай рэкламы, а па вечарах нарошчваў вейкі сяброўкам жонкі. Праз паўгода штодзённых заняткаў вынікі сталі радаваць, але думак пра ўласную справу ўсё яшчэ не было. Пазней прызнаўся сабе, што так больш працягвацца не можа, і звольніўся з асноўнай работы.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



Выпрабавана на сабе

# У пошуках «хуткай» зарплаты

## Што, акрамя яе, я знайшла ў адным са сталічных рэстаранаў

**Сродкі на жыццё, не сакрэт, патрэбныя ўсім. А студэнтам асабліва, таму што, мабыць, ні ў якім іншым узросце няма столькі сіл і энергіі, каб іх расходаваць. Ты ж прадстаўнік сучаснай інстаграмнай моладзі: і апрануцца хочацца прыгожа, і паесці смачна ў самай моднай кавярні ў горадзе, і на канцэрты, на выстаўкі хадзіць, бо вакол столькі ўсяго цікавага! А грошай няма...**

**Сёлета пытанне з падпрацоўкай паўстала перада мной асабліва востра: прыйшло ўсведамленне таго, што я ўжо зусім не малая, каб іх у мамы на марожанае прасіць. Ды і запатрабаванні, як заўважыла вышэй, сталі ўжо зусім іншыя. Пачала шукаць варыянты... Грамадскае харчаванне? Хм, напэўна, гэта тое, што трэба!**

**Запоўніла анкету на сайце папулярнай сеткі рэстаранаў хуткага абслугоўвання. Не ператэлефанавалі. Што ж, гэта сетка не адзіная, звярнулася ў іншую і — на наступную раніцу была запрошана на гутарку. Яе праводзіў сам дырэктар рэстарана. Які гонар! — думала я, адначасова ўсведамляючы, што работу атрымала.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Смачна есці!

# «Знайка» для дзіцячага арганізма

## Якім будзе новае школьнае меню?



**У 2019/2020 навучальным годзе для школьных сталовак распрацавана адзінае двухтыднёвае меню, якое ўключае як традыцыйныя стравы, так і новыя прысмакі.**

— Апошніх — дзесяць, сярод іх яблычны пірог «Смак», чымсьці падобны на шарлотку, катлета са свініны «Знайка» з дабаўленнем аўсяных шматкоў, запечанае філе птушкі «Капрэзэ» з памідорам, цефцелі з рыкотай, — паведаміла **намеснік начальніка аддзела арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Марына ДЗЯКАВА.** — У буфетах вучням прапануюцца свежая агародніна, тварожная прадукцыя, карысныя салаты, сытныя бутэрброды. Для дзяцей, якія атрымліваюць харчаванне за кошт сродкаў бюджэту, прадугледжаны сняданак і абед, а для тых, хто харчуецца за кошт сродкаў бацькоў і іх законных прадстаўнікоў, — толькі абед. З улікам таго, што сталічныя школы досыць шматлікія і накарміць усіх дзяцей у адзін прыём праблематычна, харчаванне даводзіцца арганізоўваць на кожным перапынку. Таму можа ўзнікнуць сітуацыя, калі хлопчыкі і дзяўчынкі з ільготных катэгорый прыходзяць снедаць, а школьнікі, чыё харчаванне аплачваюць бацькі, — абедаюць. Але пазней і ў дзяцей з ільготнай катэгорыі будзе такі ж абед.

Па словах Марыны Дзякавай, вучні першых-чацвёртых класаў, якіх у сталіцы каля 91 тысячы, атрымліваюць сняданак на суму 1,57 рубля. Вучням ільготных катэгорый, якіх у Мінску прыблізна 31 тысяча, даецца аднаразовае, двухразовае або трохразовае бясплатнае харчаванне: аднаразовае — да 2,11 рубля, трохразовае — да 4,65 рубля.

— Між іншым, стравы, якія даюцца ўсім вучням на выбар, зацвярджаюцца з улікам густаў дзяцей, — заўважае Марына Дзякава. — Для гэтага ў школах і гімназіях перыядычна праводзіцца анкетаванне, а таксама вядзецца тлумачальная работа як з дзецьмі, так і з іх бацькамі, прысвечаная прынцыпам здаровага харчавання.

**Начальнік аддзела па арганізацыі харчавання Нацыянальнага інстытута адукацыі Люцыя МІХАЛЬЧУК** запэўніла, што адзіны рацыён цяпер прадугледжаны для ўсіх дзяцей ва ўсіх школах краіны, не зважаючы на тое, за чый кошт яны харчуюцца: дзяржаўнага бюджэту, бацькоў ці іншых законных прадстаўнікоў.

— Харчаванне вядзецца па прыкладным двухтыднёвым рацыёне, які распрацоўваецца згодна з санітарнымі нормамі і патрабаваннямі, з улікам узросту школьнікаў. Якасць кожнай партыі прыгатаванай ежы ў сталоўках і буфетах штодня правярае бракеражная камісія, якая павінна быць створана ў школах або садках. Для дзяцей, якія па медыцынскіх паказаннях знаходзяцца на дыетычным харчаванні, забяспечваецца спецыяльны рацыён. Цяпер у краіне функцыянуе 2802 установы агульнай сярэдняй адукацыі. Пры іх працуе 3319 аб'ектаў грамадскага харчавання: 70 працэнтаў з іх — сталоўкі, астатнія — школьныя буфеты, кавярні і крамы кулінарыі.

Люцыя Міхальчук адзначыла, што ва ўстановах дашкольнай адукацыі харчаванне ажыццяўляецца пераважна за кошт бацькоў. Але пэўным катэгорыям сем'яў даюцца льготы, што зніжаюць яго цану на 50 працэнтаў. Ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі бясплатна харчуюцца дзеці з інвалíднасцю, навучэнцы, якія пакутуюць на анкалогію, сухоты, вірус імунадэфіцыту чалавека. Для дзяцей са шматдзетных сем'яў плата зніжана на 50 працэнтаў.

Калі ва ўстанове адукацыі ўзнікаюць праблемныя сітуацыі з арганізацыяй харчавання, бацькі павінны паведамляць пра гэта кіраўніку. Калі пытанне на гэтым узроўні ігнаруецца, трэба звяртацца ў аддзел ці ўпраўленне адукацыі, дзе ёсць спецыялісты, якія курыруюць арганізацыю харчавання, і гэта праблема абавязкова будзе вырашана.

«Школьнае і дашкольнае харчаванне павінна быць збалансаваным і натуральным, — падкрэслівае **кансультант аддзела метадалогіі ўпраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Анастасія ЕРАХАВЕЦ.** — Меню складаецца так, каб ежа была разнастайная. У стравах выкарыстоўваюць дабаўкі з марской капусты, у мясныя вырабы замест хлеба дадаюць крупы. Акрамя таго, два дні запар стравы не паўтараюцца. У школьных буфетах павінны быць прадстаўлены ў асартыменце натуральныя сокі, у якіх фруктовая частка складае не менш за 50 працэнтаў, кісламалочныя і малочныя прадукты. А вось кандытарскія вырабы прамысловай вытворчасці, такія як цукеркі і печыва, павінны быць абмежаваныя да двух найменняў. Піцы, смажанкі, сасіскі ў цесце могуць прысутнічаць не часцей, чым два разы на тыдзень. Акрамя таго, у буфетах арганізуюцца куткі здаровага харчавання, дзе можна набыць прадукцыю, узбагачаную пекцінам, напрыклад зефір».

Пра новыя распрацоўкі ў галіне дзіцячага харчавання расказала **вядучы спецыяліст Навукова-практычнага цэнтра па харчаванні Нацыянальнай акадэміі навук Наталля БЯЛЯКОВА:**

— У нашым «партфелі» прадстаўлена ўжо больш за 350 найменняў прадуктаў: гэта кісламалочныя, сухія малочныя прадукты, сокі, фруктова-агародніннія пюрэ, макаронныя вырабы і іншыя. Вядуцца работы па распрацоўцы чайных напояў і пітной вады для дзяцей. У рамках навукова-тэхнічнай праграмы «Дзіцячае харчаванне. Якасць і бяспека» Інстытутам мясамалочнай прамысловасці і Навукова-практычным цэнтрам па харчаванні ствараюцца спецыялізаваныя прадукты для дзяцей, хворых на фенілкетанурыю (гэта рэдкае генетычнае захворванне, пры якім у арганізме парушаецца расшчапленне незаменнай амінакіслаты). Усе прадукты для такіх дзяцей ствараюцца на аснове крухмалу.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Свой выбар

# ТАКОЕ КРЭДА: ЖЫЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ НА ЗЯМЛІ

**Днямі на тэрыторыі Мінска і Мінскай вобласці прайшоў рэспубліканскі форум сельскай моладзі. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Цэнтральны камітэт ГА «БРСМ», Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, Міністэрства адукацыі, Мінскі абласны выканаўчы камітэт, Валожынскі раённы выканаўчы камітэт, Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт.**





Урачыстае адкрыццё форуму адбылося на базе ВНУ. У мерапрыемстве брала ўдзел каля 200 маладых спецыялістаў прадпрыемстваў АПК, прадпрымальнікаў, маладых работнікаў (да 31 года) устаноў адукацыі, культуры і аховы здароўя, размешчаных у сельскай мясцовасці. Большасць удзельнікаў — моладзь Мінскай вобласці, таксама на форум былі запрошаны дэлегацыі ўсіх абласцей краіны і больш за 200 студэнтаў аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта. На адкрыцці прысутнічалі прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі, сельскай гаспадаркі і харчавання, культуры, аховы здароўя, эканомікі. У рамках мерапрыемства адбылося ўзнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага праекта «Моладзь — за ўраджай!»

Таксама ў рамках форуму прайшлі пленарныя пасяджэнні, выязная адукацыйная праграма з перспектыўным кадравым рэзервам, арганізоўвалася работа секцый «Сельская гаспадарка», «Прадпрымальніцтва», «Адукацыя», «Ахова здароўя», «Культура», «Моладзь» з удзелам прадстаўнікоў органаў дзяржаўнай улады, сельскагаспадарчых арганізацый, бізнесу, грамадскіх аб'яднанняў.

Творчым працягам мерапрыемства стаў фінал рэспубліканскага сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла». У яго спаборніцтвах бралі ўдзел шэсць маладых сем'яў з усіх рэгіёнаў краіны.

У выніку ўладальнікам ганаровага тытула стала сям'я Васіля і Кацярыны Фядотавых з аграгарадка Барчыцы Кіраўскага раёна, куды і паехаў галоўны прыз — мотакультыватар «Фермер». Другое месца ў конкурсе заняла сям'я Віктара і Наталлі Янковічаў з гарадскога пасёлка Астрына Шчучынскага раёна. Ёй дасталася пральная машына. Сям'я Барыса і Юліі Яраш з аграгарадка Крынічны Мазырскага раёна замкнула тройку лідараў. Дадому яны паехалі з новым тэлевізарам.

Апроч таго, усе сем'і-фіналісты атрымалі ў падарунак сертыфікаты на суму 80 базавых велічынь (2040 рублёў), веласіпеды, касметыку для ўсіх членаў сям'і, а дзецям яшчэ дасталіся салодкія прысмакі і мяккія цацкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота прадстаўлена БРСМ.**

Не прапусці!

# РОБАТЫ — НЕ ПРОСТА ХОБІ

**«Кубак па адукацыйнай робататэхніцы» стартуе ў Беларусі ў лістападзе. Гэта новы маштабны праект Асацыяцыі «Адукацыя для будучыні».**

Юных і дарослых аматараў гэтай дысцыпліны чакае цэлая серыя турніраў, дзе інтэлект спалучаецца са спортам, а вынаходлівасць — з вялікім аб'ёмам ведаў. «Кубак па адукацыйнай робататэхніцы» дапаможа быць на хвалі апошніх адукацыйных тэндэнцый, а таксама ператварыць асабістае хобі ў актыўнасць рэспубліканскага і нават міжнароднага ўзроўню.

Турніры пройдуць у розных гарадах Беларусі: Пінску, Мінску, Гомелі, Барысаве, Віцебску і Брэсце. Кожны з іх аб'ядноўвае некалькі спаборніцкіх катэгорый і ўяўляе сабой раўнацэнны этап у агульным «Кубку па адукацыйнай робататэхніцы»: па выніках вызначаюцца прызёры і пераможцы ў сваёй катэгорыі. Акрамя таго, пасля будуць названы абсалютныя пераможцы і прызёры ў агульным заліку ў кожнай катэгорыі (усяго 10 агульных залікаў).

Кубак стартуе ў канцы лістапада 2019 года і ўрачыста завершыцца ў маі 2020 года на самым масавым і відовішчным міжнародным робататэхнічным спаборніцтве ў Беларусі — VIII Мінскім адкрытым робатурніры.

Удзел у турнірах кубка бясплатны. Стаць удзельнікам можа кожны ахвотны. Адна каманда можа прымаць удзел у некалькіх спаборніцкіх катэгорыях, калі толькі яны не праходзяць у адзін час.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Бачыць мэту*

# СТУДЭНТ, ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ВЫРАШЫМ РАЗАМ

**У Мінску прайшло першае ў гэтым навучальным годзе пасяджэнне Грамадскага рэспубліканскага студэнцкага савета, удзел у якім узяў міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА. Акрамя таго, на пасяджэнні прысутнічалі маладзёжныя паслы Мэт устойлівага развіцця, прадстаўнікі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, супрацоўнікі Рэспубліканскага маладзёжнага цэнтра.**



Фота БелТА.

— Радуе, што нашы сустрэчы — не звычайная фармальнасць, у нас адбываецца канструктыўны дыялог адносна развіцця маладзёжнай палітыкі, рэалізацыі правоў моладзі, а таксама вырашэння праблем у сістэме адукацыі. Цяпер выкладчык — не адзіная крыніца інфармацыі, мы таксама вучымся ў вас, — заўважыў міністр. — Студэнцтва можа і павінна прымаць удзел ва ўдасканаленні сучасных адукацыйных працэсаў. Студэнцкі савет не толькі займаецца вырашэннем нейкіх гаспадарчых пытанняў, але і можа аказваць уплыў на фарміраванне навучальных планаў. Прадстаўнікі Студэнцкага савета запрашаюцца на розныя пасяджэнні і нарады. А некаторыя з вас уваходзяць у склад навуковых саветаў універсітэта.

Ігар Карпенка падкрэсліў, што асноўны акцэнт у развіцці вышэйшай школы робіцца сёння на практыка-арыентаванасць навучання: «Лідарскія якасці, уменне аб'ядноўваць людзей і нацэльваць іх на рашэнне агульных задач магчыма набыць толькі падчас практычнай дзейнасці. Але часта назіраеш, як выпускнікі ВНУ, што прыступілі да работы, не спраўляюцца са сваімі абавязкамі. Для гэтага трэба фарміраваць адзіны прафесійны стандарт будучага маладога спецыяліста».

Удзельнікі сустрэчы ўзнялі пытанні з розных сфер студэнцкага жыцця. Традыцыйна моладзь людзі пацікавіліся ў міністра наконт абавязковага размеркавання маладых спецыялістаў. Як адзначыў Ігар Карпенка, з кожным годам тых, хто вучыўся платна і хоча, каб яму далі першае рабочае месца, становіцца ўсё больш. Летась было задаволена каля тысячы такіх пажаданняў. Прагучала і пытанне пра Закон аб адтэрміноўцы, на што міністр адукацыі адназначна адказаў: служба ў арміі спрыяе развіццю асобы і вельмі важная для нашай дзяржавы.

«Як нам, актывістам, знайсці агульную мову з выкладчыкамі, калі ва ўніверсітэце ўпэўненыя, што вучоба павінна стаяць на першым месцы, а грамадская дзейнасць — на другім?» — прагучала пытанне ад аднаго з членаў Грамадскага студэнцкага савета. Ігар Карпенка параіў не канцэнтраваць увагу на нечым адным і не чакаць паслабленняў ад выкладчыкаў, а быць гатовым да напружанай працы ў вольны ад вучобы час. У якасці прыкладу міністр прывёў свае студэнцкія будні, калі ён таксама сумяшчаў і грамадскую дзейнасць, і вучобу. Ігар Карпенка звярнуў увагу на тое, што актыўны ўдзел у грамадскім жыцці аказвае ўплыў на фарміраванне сацыяльных і камунікатыўных навыкаў: «Практычна ўсе вы будучыя кіраўнікі. Магчыма, хто-небудзь з вас пойдзе ў палітыку, стане дэпутатам. Тут нідзе важны навык стасункаў з людзьмі».

Кіраўнік галіны таксама заклікаў маладых людзей прыняць актыўны ўдзел у абмеркаванні пытанняў зместу вышэйшай адукацыі. Ён паведаміў, што рабочая група ў складзе вучоных і метадыстаў падрыхтавала канцэпцыю, якую мае намер абмеркаваць з кіраўнікамі кафедраў грамадскіх навук ВНУ. «На нашу думку, павінны застацца дзве дысцыпліны адукацыйнага дзяржаўнага кампанента — філасофія і гісторыя беларускай дзяржаўнасці», — патлумачыў сутнасць канцэпцыі міністр.

Спецыяльны курс па гісторыі беларускай дзяржаўнасці, па яго словах, не будзе дубліявацца са школьным, у ім будуць глыбей закранацца пытанні фарміравання суверэннай Беларусі, яе грамадска-палітычнай сістэмы, эканамічнай мадэлі г. д. Усяго ў пералік дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага блока плануецца ўключыць 20 прадметаў, у тым ліку паліталогію, рэлігіязнаўства, эканамічную тэорыю, сацыялогію і іншыя.

Падчас сустрэчы ўдзельнікі абмеркавалі вынікі работы Грамадскага рэспубліканскага студэнцкага савета, правядзенне Нацыянальнага маладзёжнага студэнцкага форуму ў 2019 годзе, разгледзелі і ўнеслі некаторыя прапановы ў праект Стратэгіі развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь да 2030 года, а таксама механізмы ўключэння моладзі ў дзейнасць па рэалізацыі нацыянальнай стратэгіі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*Крок да прафесіі*

# Хто тут апошні ў фінансісты?

**БДУ пачынае прыём заявак на навучанне ў «Школе юных эканамістаў». Яе слухачамі могуць стаць школьнікі, ліцэісты і гімназісты 8-11 класаў. Мэта курса — сістэматызацыя эканамічных ведаў у навучэнцаў і павышэнне ўзроўню іх фінансавай асветы. Школу будзе праводзіць эканамічны факультэт ВНУ.**



Лекцыі і семінары ахопяць пытанні банкаўскай сістэмы, асаблівасці работы аўдытарскіх, кансалтынгавых і фінансавых кампаній, IT-сферы і г. д. Выкладчыкамі школы выступяць студэнты і магістранты БДУ. Яны падзеляцца вопытам вучобы ва ўніверсітэце і дапамогуць абітурыентам вызначыцца з выбарам спецыяльнасці. У рамках праграмы для юных эканамістаў прадугледжаны таксама экскурсіі на буйныя прадпрыемствы, у фінансавыя кампаніі і банкаўскія ўстановы Мінска.

Пры паспяховым заканчэнні школы абітурыентаў гэтага года чакае прыемны бонус: паступаючы на эканамічны факультэт БДУ, яны будуць мець пераважнае права пры залічэнні ў выпадку роўных умоў. Гэта пашыраецца на тых, хто паступае на вочную і завочную форму навучання.

Адбор заявак будзе праходзіць на конкурснай аснове. Для ўдзелу неабходна мець агульны бал паспяховасці за папярэдні навучальны год не ніжэй за «7», а таксама напісаць матывацыйны ліст.

Заняткі будуць праходзіць у групах (8-9 класы і 10-11 класы) на эканамічным факультэце па суботах у перыяд з 16 лістапада да 28 сакавіка.

Навучанне бясплатнае. Рэгістрацыя слухачоў вядзецца з 1 да 31 кастрычніка ўключна.

З падрабязнай інфармацыяй аб рабоце школы і рэгістрацыі слухачоў можна азнаёміцца на сайце эканамічнага факультэта БДУ.

*З «базай» у галаве*

# Думаць як прадпрымальнік

**У БДУ ўпершыню стартавала стартап-школа CITO. Яна скіравана на развіццё маладзёжнага прадпрымальніцтва ў студэнцкім асяроддзі. Удзельнікам гэтага праекта мог стаць любы студэнт, магістрант альбо малады выкладчык БДУ, зацікаўлены ў стварэнні ўласнага бізнесу. Яны змогуць развіць або распрацаваць унікальны прадукт, знайсці аднадумцаў і сабраць каманду.**



Слухачы стартап-школы атрымаюць веды аб вядзенні бізнесу ад паспяховых прадпрымальнікаў, навучацца тэхнікам і інструментам для запуску ўласнага праекта, а таксама методыкам развіцця прадпрымальніцкага мыслення.

Выкладчыкамі ў школе выступяць бізнесмены-практыкі, маладыя прадпрымальнікі, прадстаўнікі ўніверсітэтаў, навуковых арганізацый, бізнес-супольнасцяў і прадпрыемстваў. У праграму навучання ўвойдуць дысцыпліны па мэтапалажэнні ў бізнесе, распрацоўцы бізнес-плана, развіцці soft skills (кіраўніцкіх здольнасцяў, сацыяльных навыкаў і асабістых якасцяў) і hard skills (навыкаў у продажы і маркетынгу, праектным менеджменце, бухгалтарскім уліку) і іншыя.

Пачаткоўцы-бізнесмены даведаюцца пра тое, як вырашаць адміністрацыйныя праблемы, выпрацоўваць стратэгію, весці перамовы з партнёрамі, інвестарамі і крэдытнымі арганізацыямі, навучацца складаць бізнес-планы, распрацоўваць бізнес-прапановы для інвестараў і г. д.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Хто прыйшоў!*

# ВЕДАЕЦЕ, ЯК ЯЕ ЗАВУЦЬ?

**Трэцякурсніца МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ Аліса Селязнёва стала старшынёй Каардынацыйнага савета органаў студэнцкага самакіравання Студэнцкай вёскі. Дзяўчына цяпер з'яўляецца таксама намеснікам старшыні Каардынацыйнага савета Студэнцкага гарадка БДУ і старшынёй Студэнцкага савета інтэрната № 4 універсітэта.**




Каардынацыйны савет Студэнцкай вёскі ўяўляе сабой дарадчы, калегіяльны орган студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ, БДПУ імя Максіма Танка, БДМУ, МДЛУ і БДУІР. Грамадская арганізацыя аб'ядноўвае дзевяць інтэрнатаў комплексу «Студэнцкая вёска». У цэнтры яе ўвагі знаходзіцца ідэалагічная і выхаваўчая работа са студэнтамі, якія пражываюць на тэрыторыі комплексу.

Зацвярджэнне новага савета і абранне яго старшыні ажыццяўляецца штогод шляхам адкрытага галасавання на выбарчым сходзе.

*Знайсці сябе*

# Піша, гаворыць і паказвае моладзь

**Каля 50 старшакласнікаў школ, гімназій і ліцэяў сталі слухачамі першай у Беларусі «Школы юных журналістаў і блогераў». Урачыстае адкрыццё адукацыйнага сезона адбылося ў БДУ. Мэта школы — дапамагчы выпускнікам у выбары будучай прафесіі.**

Навучанне будзе праходзіць раз у месяц да мая ўключна. Школьнікі пазнаёмяцца са спецыфікай журналісцкай дзейнасці, усімі этапамі падрыхтоўкі медыяпрадукту, навучацца пісаць рэпартажы і браць інтэрв'ю, рыхтаваць цікавыя навіны. Праграма школы ўключае розныя майстар-класы, сустрэчы з вядомымі журналістамі і блогерамі. Выкладчыкамі выступяць вопытныя практыкі з Беларусі, Расіі і іншых краін.

Адукацыйны праект з'яўляецца сумесным ініцыятывай БДУ, камітэта па адукацыі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, Беларускага саюза журналістаў пры падтрымцы БелТА, АНТ, інфармацыйнага агенцтва «Мінск-Навіны» і Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
3 10 2019 г.

*Добрыя сэрцам*

# НАДЗЕЮ ДОРЫЦЬ «СЛОН»

**Менавіта так называецца валанцёрскі клуб Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Чаму не атрад, як гэта бывае звычайна, і адкуль узнікла назва? Мы сустрэліся з членамі гэтага добраахвотнага аб'яднання і яго заснавальніцай Анжалікай БАЙКО, старшым выкладчыкам кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці ВНУ.**



— Сапраўды, у снежні 1999 года са студэнтаў нашай кафедры, якія навучаліся па спецыяльнасцях «сацыяльная работа», «сацыяльная педагогіка» і праходзілі на першым курсе практыку пад назвай «Міласэрнасць», напачатку былі створаны добраахвотніцкі атрад. Ён ставіў мэтай даць кожнаму яго члену магчымасць сфарміраваць прафесійныя кампетэнцыі і развіць важныя асабістыя якасці. Першыя пяць гадоў назвы ў атрада не было, але з прычыны павелічэння колькасці суб'ектаў дапамогі, неабходнасці ўдзелу ў розных конкурсах і падачы праектных заявак, гэта пытанне стала падымацца. А ў 2010 годзе атрад быў пераўтвораны ў клуб, — расказала пра гісторыю стварэння «Слана» Анжаліка Пятроўна.

— Слова «клуб» было больш знаёма студэнтам БДУКМ, бо іх нярэдка размяркоўвалі менавіта ў такія сельскія ўстановы, — смеючыся, дадае Настасся КУЗЬМІЧ, камандзір аб'яднання ў 2009—2012 гадах, якая цяпер працуе мастаком-рамеснікам. — Дарэчы, Анжаліка Пятроўна і «прывяла» «Слана» ў клуб. Насамрэч гэта абрэвіятура, якая расшыфроўваецца як «слова любви, обретающие надежду».

На сёння валанцёрскі клуб «СЛОН» мае найбагацейшы вопыт удзелу ў мерапрыемствах самай рознай накіраванасці. Гэта і арганізацыя дзейнасці з дзецьмі-сіротамі і дзецьмі-інвалідамі, і наведванне дамоў ветэранаў... Канцэрты, конкурсы, тэатралізаваныя паказы, дапамога ў добраўпарадкаванні тэрыторый... Арганізацыя і ўдзел у сумесных міжнародных, рэспубліканскіх праектах, гарадскіх сацыяльна-культурных мерапрыемствах...

— Іх бывае па тры-чатыры за дзень. Для мяне, напрыклад, самым маштабным з такіх стаў модны паказ «Каляровыя сны», ён праходзіў у Нацыянальнай школе прыгажосці. Юныя мадэлі з ліку дзяцей-сірот, што да таго ж маюць розныя асаблівасці развіцця, выходзілі на подыум у адзенні, якое спецыяльна пашылі мадэльеры, а сам выхад суправаджаўся выступленнем вядомых артыстаў беларускай эстрады. Падчас кожнага такога мерапрыемства ўсведамляеш, што ўсё ты рабіў нездарма, і чакаеш рэалізацыі новых ідэй, — дзеліцца Кірыл ГРОМАЎ, студэнт другога курса факультэта культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Настасся ГРЫЦКЕВІЧ, выпускніца 2019 года, а цяпер малады спецыяліст культурна-забаўляльнага цэнтра «Рытм» ААТ «Керамін», расказала пра вопыт супрацоўніцтва з папраўчай установай адкрытага тыпу № 35 у Мінску:

— Калі пачула першы раз, дзе трэба валанцёрыць, пачуцці былі, шчыра кажучы, змешаныя. Я не зусім разумела, як з тымі хлопцамі камунікаваць, пра што гаварыць. Баялася, як на мяне будуць рэагаваць, ці ўспрымуць усур'ёз і г. д. Але ўжо пасля першай рэпетыцыі мы абдымаліся пры расставанні і планавалі далейшае супрацоўніцтва. Вядома, былі пэўныя моманты, якія патрабавалі большай стараннасці і цярпення з майго боку, але я разумела, што і ім даводзіцца часам пераступаць цераз сябе. Сумеснымі кампрамісамі і саступкамі мы намацалі шлях работы адно з адным. Наша сяброўства (не пабаюся гэтага слова) пачалося са снежня мінулага года і паспяхова доўжыцца дагэтуль. Разам мы ўжо ўвасобілі ў жыццё шмат праектаў, акцый і мерапрыемстваў, за гэты час хлопцы сталі больш мяккія і камунікабельныя ў стасунках. Я думаю, што гэта наша агульная заслуга. Мы, у сваю чаргу, пазбавіліся ад многіх забабонаў, перагледзелі некаторыя жыццёвыя ўстаноўкі. Гэтае супрацоўніцтва пайшло на карысць абодвум бакам.

Па словах Кірыла Громава, «кожнае мерапрыемства, кожнае праведзенае імгненне ў клубе нясуць толькі станоўчыя эмоцыі. Вядома, перыядычна ўзнікаюць пэўныя цяжкасці, але дзякуючы зладжанай рабоце хлопцаў і дзяўчат і падтрымцы куратара Анжалікі Пятроўны мы іх пераадольваем».

«Немагчыма растлумачыць словамі тыя эмоцыі і прычыны, якія натхняюць займацца валанцёрствам, — кажа Настасся Грыцкевіч. — Сябры ставяцца да яго вельмі па-рознаму. Некаторыя ўжо ўступілі ў наш клуб, што для мяне вельмі важна. Але мы ніколі не прымушаем і знарок не агітуем. Прыемна, калі людзі самі да гэтага прыходзяць».

Дзмітрый КАРАКУЦА, выпускнік 2019 года, які цяпер працуе асістэнтам івэнт-менеджара ў рэкламным агенцтве, раіць людзям, якія хацелі б стаць валанцёрамі, але па нейкіх прычынах баяцца пачаць: «Трэба не хвалявацца, а зрабіць першы крок, прыняць удзел у некалькіх мерапрыемствах і ўсё — адказ прыйдзе сам сабой».

**Ангеліна НОВІКАВА,
студэнтка III курса
Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта культуры
і мастацтваў.**

# МУЖЧЫНСКІЯ РУКІ ДЛЯ... ЖАНОЧЫХ БРОВАК

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**Надзея:** — Калі ў нас з'явілася дзіця, працаваць з людзьмі ў кватэры стала ўжо немагчыма. Часу на роздумы не было, і грошы, адкладзеныя на машыну, сышлі на арэнду кабінета і яго ўладкаванне. Каб пра нас даведалася вялікая аўдыторыя, запусцілі групу «Укантакце».

***— Вы хутка сфарміравалі каманду майстроў?***

**Фёдар:** — Для нас гэта аказалася складанай задачай. Мы шукалі іх праз сацсеткі, знаёмствы, папулярныя платформы, але зваротнай сувязі не было. Аказалася, што ахвотных працаваць у такім «асаблівым» салоне прыгажосці, як наш, няшмат. Хтосьці пытаўся, ці не жарт гэта, а нехта казаў, каб мы не займаліся глупствамі і ішлі на завод. Першага майстра — Аляксандра — знайшлі праз паўгода беспарапыннага пошуку. Пераехалі ў больш зручнае і прасторнае памяшканне, вырашылі, што больш эфектыўна вучыць хлопцаў з нуля. Цяпер у нашай камандзе ўжо сем чалавек, але мы і далей працягваем набіраць да сябе амбіцыйных і працавітых майстроў.

**«Бывае, што сярод усіх удзельнікаў спаборніцтваў я адзіны мужчына, і мне гэта падабаецца».**

**Надзея:** — На пачатковым этапе развіцця не раз чулі ў свой адрас не вельмі прыемныя словы кшталту: «Гэта не мужчынская справа». З тых, хто адгукаўся на вакансіі, да гутаркі даходзіла толькі палова. Дарэчы, часам добрыя майстры не становяцца часткай нашай каманды, бо для нас важныя не толькі прафесійныя якасці, але і асабовыя.

**Фёдар:** — Дарэчы, і ў Беларусі, і за мяжой такі тып салонаў прыгажосці амаль што не сустрэнеш. Мы даём магчымасць навучацца, развівацца і добра зарабляць супрацоўнікам, нават калі яны знаходзяцца на стажыроўцы. Негатыўныя меркаванні мы навучыліся прапускаць міма вушэй, канцэнтруемся толькі на сваіх выніках. Тыя, хто чуюць пра наш салон, падзяляюцца на два лагеры: хтосьці ў захапленні ад ідэі, а нехта катэгарычны ў сваіх перакананнях. У месяц да нас прыходзіць каля 300 чалавек, часам зазіраюць і хлопцы, напрыклад, аднаго з пастаянных кліентаў прывяла жонка, якая таксама з'яўляецца нашай наведвальніцай.

**«У Беларусі адкрываць салоны не плануем, бо падабаецца, што наш адзіны ў сваім родзе. А вось за мяжой — так».**



***— У вас шмат розных кубкаў і ўзнагарод. Ці лічыце гэта важным складнікам паспяховасці?***

**Фёдар:** — Як толькі захапіўся бьюці-сферай, пачаў удзельнічаць у разнастайных міжнародных чэмпіянатах. Цяпер ужо і не палічу, колькі іх было і колькі ўзнагарод прывёз адтуль. Бывае, што сярод усіх удзельнікаў спаборніцтваў я адзіны мужчына, і мне гэта падабаецца. Неяк сказаў жонцы, што гатовы вучыць іншых, быць настаўнікам, а яна адказала: «Перш чым гэта рабіць, у цябе павінен быць статус, вопыт і ўзнагароды». Надзя заўсёды матывуе мяне на развіцці, кажа: «Ты ж выйграеш яшчэ адзін раз, ці табе складана?» А я ёй у адказ: «Глядзі, вось прывёз чатыры кубкі. Цяпер мне ўжо можна ажыццявіць сваю задуму?» *(усміхаецца).*

***— Напэўна, у вас былі памылкі на розных этапах вядзення бізнесу. Падзяліцеся, як з імі спраўляліся.***

**Надзея:** — Спачатку я была залішне добрая і лаяльная ў адносінах да некаторых. Цяпер умею аддзяляць асабістыя стасункі і рабочыя, лічу, што вельмі важна ўмець гэта рабіць.



***— Калі вы дома, умееце пераключацца і не думаць пра работу?***

**Фёдар:** — Так у нас не атрымліваецца, бо ёй мы прысвячаем увесь свой час. Тое, што мы пара, якая заўсёды разам, нават дапамагае, дае больш энергіі. У нас няма падстаў для сварак, мы займаемся развіццём агульнай справы, і гэта нам падабаецца.

**Надзея:** — Нават адпачыць не можам вырвацца на тыдзень. Якія там пустыя размовы і канфлікты *(усміхаецца)*!

***— Як плануеце развіваць бізнес далей?***

**Фёдар:** — У Беларусі адкрываць салоны не плануем, бо падабаецца, што наш адзіны ў сваім родзе. А вось за мяжой — так. Важна ствараць праекты, запускаць навучальныя курсы і трэнінгі, прыдумляць новыя фішкі і пастаянна здзіўляць сваіх кліентаў. Напрыклад, у хуткім часе на нашым «ютуб»-канале выйдзе рэаліці-шоу «Немужчынская справа» — яно пра тое, як шэсць хлопцаў хочуць трапіць у індустрыю прыгажосці і робяць усё для таго, каб стаць прафесіяналамі сваёй справы. Абяцаю, гэта будзе крута!

***— Якія цяпер трэнды на вейкі і бровы?***

**Фёдар:** — У модзе натуральнасць. Калі казаць пра форму першых, то актуальным з'яўляецца «л-выгіб», гэта вельмі незвычайна і свежа. А вось ад вялікіх, доўгіх і тоўстых лепш адмовіцца, гэта мала каму пасуе. Дарэчы, парада для дзяўчат: калі вам нарошчваюць вейкі тры-чатыры гадзіны — гэта нармальна. Сумненні павінны ўзнікаць тады, калі майстар спраўляецца за гадзіну, а то і менш, бо можна атрымаць не вельмі якасны вынік. Бровы прыгожыя тады, калі яны дагледжаныя і густыя. Не трэба іх вышчыпваць, забудзьце пра пінцэт. Лепш кожны дзень наносьце на іх касметычнае масла і расчэсвайце — будуць здаровыя бровы, якім можна надаць любую патрэбную форму.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**


ЗВЯЗДА

*Даходнае месца*

# БОНУС ДА СТЫПЕНДЫІ,

## або Ці цяжка сумяшчаць вучобу і падпрацоўку

**Пагадзіцеся, амаль кожны хоча пачаць зарабляць грошы як мага раней. Але калі вучышся ў школе, то варыянтаў не так ужо і шмат. А вось у студэнтаў адкрываюцца трохі іншыя магчымасці: і па часе, і па прапановах. Напрыклад, можна знайсці работу з частковай занятасцю — на чатыры-пяць гадзін на дзень.**

Спачатку, як правіла, маладыя людзі спрабуюць сябе ў якасці афіцыянтаў, апаратараў кол-цэнтра ці прамоўтараў — менавіта па гэтых вакансіях не звяртаюць увагу на наяўнасць скончанай адукацыі і вялікага досведу. Можна дамовіцца на індывідуальны графік. Па грашах прыкладна атрымліваецца 350—400 рублёў.

Вікторыя Сашко, студэнтка чацвёртага курса факультэта журналістыкі БДУ, не выключэнне — яе «кар'ерны шлях» пачаўся з рэкламы і прома.

— Ішла ў гэтую сферу, безумоўна, каб падзарабіць. Потым з'явілася жаданне «прапампаваць» сябе ва ўсіх кірунках журналісцкай дзейнасці. Цяпер пішу матэрыялы ў якасці пазаштатніка, што вельмі зручна з-за графіка — ты сам яго будуеш. Хоць такая работа не зусім задавальняе па грашах. Тым не менш пакуль студэнт — гэта нармальна, — сцвярджае Вікторыя.


Вікторыя Сашко.

Некаторыя, пачынаючы працаваць, думаюць, што было б цудоўна знайсці аднадумцаў і стварыць цэлую каманду для рэалізацыі сумесных праектаў. Андрэй Патупчык, Настасся Базоўкіна, студэнты трэцяга курса Інстытута бізнесу БДУ, і Ягор Русак, студэнт трэцяга курса Інстытута правазнаўства, аб'ядналіся, каб крэатыўна і хутка выконваць задачы. Андрэй дзеліцца, як усё пачалося:

— Першую падпрацоўку СММ-спецыялістам знайшоў па дагаворы падраду яшчэ ў 10-11 класе ў арганізацыі, якая займалася продажам ролікавых канькоў. Плацілі 200 рублёў, чаму, безумоўна, быў вельмі рады — школьніку дастаткова. Калі паступіў ва ўніверсітэт, то захацелася чагосьці большага: праз інтэрнэт знайшоў вакансію СММ-менеджара і ўладкаваўся яшчэ ў адну кампанію. Калі падсумаваць, то атрымлівалася 400 рублёў — дастаткова для пачатку.

Хоць ён прызнаецца, што сам не разумее, як сумяшчаў два праекты і вучобу. І адначасова сцвярджае, што гэта... лёгка. Таму пасля першага курса ў хлопца з'явілася жаданне і на... трэцюю падпрацоўку. Яна была больш прэстыжная і сур'ёзная — у аддзеле маркетынгу Інстытута бізнесу БДУ. І тут Андрэй дамовіўся на заробак у 200 рублёў. Праўда, на гэтай новай падпрацоўцы пачалі даваць шмат цікавых заданняў, а часу ўжо не хапала. Давялося ўсё ж пакінуць кампанію, з якой ён некалі пачынаў, — па продажы ролікавых канькоў. «Я вырашыў, што вопыт даражэйшы за лішнія грошы», — кажа ён.


Настасся Базоўкіна, Андрэй Патупчык і Ягор Русак.

— Пачаў шукаць хлопцаў і дзяўчат, якія хацелі б працаваць у сферы СММ. Мы падзялілі задачы: я наладжваў рэкламу, Настасся пісала тэксты для пастоў у сацыяльных сетках, Ягор маляваў карцінкі ў фаташопе. Пачалі шукаць новых кліентаў і адначасова прасіць больш высокую аплату. Матывавалі тым, што эфектыўнасць будзе ў тры разы вышэйшая, калі за СММ возьмецца не адзін чалавек, а цэлая каманда. Ці было на гэтым этапе цяжка? Ды не, проста ведаў, што пасля ўніверсітэта еду ў офіс — хто хоча, той круціцца. У нас ужо нават запланавана правесці канферэнцыю ў БДУ восенню, дзе мы хочам адкрыць сакрэты, як вучыцца і зарабляць адначасова, — дзеліцца Андрэй.

**Паліна БЕРТАШ, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.**

# У пошуках «хуткай» зарплаты

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

...Калі ўсе неабходныя фармальнасці былі выкананыя, я пачала працаваць. Расклад быў такі. Ты запісваеш свае магчымасці па часе на тыдзень наперад у адмысловы журнал, і ў 80 працэнтаў выпадкаў яны ўлічваюцца. Калі ўзнікаюць форс-мажорныя сітуацыі (напрыклад, хто-небудзь з супрацоўнікаў раптам сыходзіць на бальнічны), цябе могуць папрасіць затрымацца або выйсці ў выхадны. Але ты заўсёды можаш адмовіцца.

Аплата пагадзінная. У члена каманды (першая пасада ў кар'ернай лесвіцы) заробак складае 3,15 рубля ў гадзіну (без уліку падаткаў). Час работы фіксуецца біясканам твайго адбітка пальца, так што ніводная адпрацаваная хвіліна звыш змены не застанецца неаплачанай.

Першыя тры тыдні я працавала выключна ў зале: выцірала сталы, мыла падлогу, сачыла, каб не перапаўняліся сметніцы, і выносіла іх змесціва. Таксама адказвала за чысціню ў прыбіральні. Дарэчы, усе ў камандзе калісьці былі «зальшчыкамі», хтосьці больш па часе, нехта менш. Але праз гэта праходзяць усе без выключэння. Работа не самая прыемная, але нядрэнная. Нядрэнная таму, што можна займацца справамі ў адносна размераным тэмпе. Галоўнае — заўсёды падтрымліваць чысціню.

Напачатку шчыравала нядоўга: па чатыры-шэсць гадзін, а пасля змены прыязджала дадому і займалася дыстанцыйным навучаннем. Бо, каб працаваць на любым месцы ў рэстаране (кухня, каса, збор заказаў альбо ў зале), акрамя практычнага навучання ўсе павінны прайсці яшчэ і тэарэтычнае дыстанцыйнае. Пасля трэнер — супрацоўнік, якому гэта даручана, — павінен цябе атэставаць. Толькі тады можна стаць паўнавартасным членам каманды і, адпаведна, несці адказнасць за парушэнне тых правілаў, якім ты быў навучаны.

Здавалася б, вельмі простая ўмова, але спраўляюцца з ёй не ўсе.

Стрэсаўстойлівасць. Так-так, гэтая рыса характару прапісваецца ў патрабаваннях амаль да кожнай вакансіі. На яе сапраўды варта звярнуць увагу: паток наведвальнікаў бывае вельмі вялікі, людзі розныя, а тэмп працы часам — шалёны. Эмацыянальная і фізічная стомленасць можа не адбіцца на асабістым жыцці толькі ў тым выпадку, калі будзеш ставіцца да ўсяго з працэсей: усё гэтак жа адказна, але з разуменнем таго, што, які б цяжкі ні быў дзень, бліжэй да вечара наведвальнікаў стане менш. І ты спакойна, напяваючы пад нос сваю любімую песню, будзеш прыбірацца на рабочым месцы ці балбатаць пра нешта з калегамі. І праз некаторы час выйдзеш з работы са спакойнай душой і без жадання абрынуць на каго-небудзь з блізкіх увесь эмацыянальны цяжар, назапашаны за дзень.

Важныя ўмовы для ўладкоўвання, пра якія мяне адразу папярэдзілі:
- ты павінен быць паўналетнім;
- трэба мець (або зрабіць) санітарную кніжку, без яе выхад на работу немагчымы;
- вельмі важны пункт для ўсіх дзяўчат — гель-лак і наогул любое пакрыццё на пазногцях строга забароненыя;
- падчас работы ювелірныя ўпрыгажэнні, аксэсуары і пірсінг павінны адсутнічаць;
- мабільны тэлефон увесь твой рабочы час (акрамя абеду) будзе ляжаць у раздзявальні. І ніяк інакш.

...Калі гэты перыяд быў паспяхова пройдзены, наступным рабочым месцам для мяне стала кухня. Наступным і апошнім. Бо ў першы ж дзень там стала зразумела (даруйце нясціпласць): я нядрэнна спраўляюся. Хутка запомніла ўсе рэцэптуры і тэхналогію. А калі працавала на іншых месцах (збор заказаў, каса) — «тармазіла» і рабіла памылкі. Не маё. Адсюль высноўа: калі ты акажашся, напрыклад, прыроджаным касірам, будзеш працаваць пераважна ім.

Уладкоўваючыся на падобнага кшталту работу, трэба абавязкова ўлічваць яшчэ адзін момант: неабходна ўмець размаўляць з людзьмі. Зваротная сувязь вельмі важная. Прычым не мае значэння, дзе ты працуеш: на касе ці на кухні. Напрыклад, касіры павінны ведаць, калі скончацца памідоры. А ты, шчыруючы на кухні, — атрымаць інфармацыю пра тое, у які нумар заказу прабілі (умоўна) страву з дадатковым сырам. Зваротная сувязь павінна быць гучнай і выразнай.


Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Наконт харчавання. Бясплатнага, хутчэй за ўсё, не будзе. Але дадуць добрыя зніжкі на частку прадукцыі, якія часам дасягаюць 50 працэнтаў ад кошту. Калі змена восем гадзін, час абеду складае 30 хвілін. Калі дванаццаць — можаш сысці на абед двойчы за дзень таксама на паўгадзіны кожны раз.

Аб сумяшчэнні з вучобай. Будзе стома, і гэта непазбежна. Гадзінамі стаяць на нагах, не маючы магчымасці прысесці, а часам і проста папіць вады, — гэта няпроста. А калі пасля такой працоўнай змены трэба ісці дадому і выконваць дамашняе заданне, а пасля яшчэ і рана прачынацца на наступны дзень — ну зусім няпроста. Але магчыма. Я працавала з тымі, хто не першы год сумяшчае падпрацоўку з вучобай. І яны казалі, што паступова прызвычаіліся да такога графіка.

Многія з пастаянных супрацоўнікаў атрымліваюць спецыяльнасці, звязаныя з гандлем, бізнесам і фінансамі: лагісты, эканамісты, маркетолагі. Пасля заканчэння навучання яны могуць разлічваць па месцы падпрацоўкі і ісці ўверх па кар'ернай лесвіцы. У дачыненні да апошняй тут няма ніякіх перашкод — праходзіш навучанне на наступную па вышыні пасаду, паспяхова здаеш іспыт і — вуаля! Такім чынам, ад шараговага члена каманды за некалькі гадоў можна дарасці да дырэктара рэстарана. І я асабіста знаёмая з такім чалавекам.

Супольная дзейнасць, аказваецца, вельмі збліжае. На рабоце я сустрэла незвычайных і блізкіх мне па духу людзей. Мы настолькі парадніліся, што нават жартавалі з калегамі, быццам у нас свой сямейны бізнес, і мы ўсе вельмі стараемся на карысць агульнай справы. Шмат хто знайшоў сярод калег сваю другую палавінку. Толькі ў нашым рэстаране былі тры шчаслівыя маладыя пары, якія пазнаёміліся на рабоце.

...Не паверыце, звальнялася са слязамі на вачах. І засталася б, калі б не марыла рэалізаваць сябе зусім у іншай сферы.

Смела магу сказаць, што гэты працоўны досвед аказаўся самым удалым сярод усіх маіх папярэдніх. Усё дзякуючы прыязнаму маладому калектыву, члены якога вельмі мэтанакіраваныя, амбіцыйныя і працавітыя. Яны ўмеюць якасна працаваць і весела адпачываць.

Каб зразумець сэнс загалоўка да канца, думаю, трэба самастойна пакаштаваць усё гэта «на смак». І менавіта як падпрацоўку — вельмі раю! У якасці чагосьці большага — калі тое супадае з вашымі жыццёвымі планамі і мэтамі.

**Паліна ПРАКАПЕНЯ, студэнтка II курса факультэта журналістыкі БДУ.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «Отдых-2010» (Продавец), расположенного по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Драчковский с/с, 23, вблизи д. Волма

**Лот № 1, состав:** 1. Административное здание, инв. № 614/С-23465, площадь – 105,8 кв. м. 2. Гостевой домик № 1, инв. № 614/С-41796, площадь – 74,8 кв. м. 3. Гостевой домик № 2, инв. № 614/С-42046, площадь – 75,7 кв. м. 4. Гостевой домик № 3, инв. № 614/С-42050, площадь – 76,3 кв. м. 5. Гостевой домик № 4, инв. № 614/С-42051, площадь – 117,3 кв. м. 6. Здание КПП, инв. № 614/С-23933, площадь – 40,7 кв. м. 7. Физкультурно-оздоровительный комплекс, инв. № 614/С-23462, площадь – 350,8 кв. м. 8. Овощехранилище, инв. № 614/С-23936, площадь – 110,5 кв. м. 9. Столовая, инв. № 614/С-23469, площадь – 698 кв. м. 10. Радиоузел, инв. № 614/С-23932, площадь – 11,4 кв. м. 11. Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 614/U-46148, площадь – 1370,6 кв. м. 12. Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 614/U-46146, площадь – 787,5 кв. м. 13. Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 614/U-46147, площадь – 799,1 кв. м. 14. Здание туалета, инв. № 614/С-46183, площадь – 14,1 кв. м. 15. Электрощитовая, инв. № 614/С-46182, площадь – 8,2 кв. м. 16. Артезианская скважина, инв. № 614/С-23466, площадь – 71 кв. м. 17. Водонапорная башня, инв. № 614/С-23939, объем 25 куб. м. 18. Сеть водоснабжения, инв. № 614/С-23937, площадь – 1303,2 кв. м. 19. Сеть кананализации, инв. № 614/С-23940, площадь – 1213,9 кв. м. 20. Тепловая сеть, инв. № 614/С-23938, протяженность 375,7 м. 21. Газопроводы высокого и низкого давления, инв. № 614/С-46057, протяженность 515,6 м. 22. Телефонная канализация, инв. № 614/С-46224, площадь – 11,2 кв. м. 23. Прочее имущество (полный перечень приведен на сайте Организатора аукциона ino.by).

**Земельный участок для обслуживания объектов недвижимости № 1–22** площадью 6,0528 га с кадастровым номером 624800000001000405. Право постоянного пользования. **Земельные участки для обслуживания части объекта недвижимости № 19:** 1. Площадь 0,0049 га, кадастровый номер 624800000001005031. 2. Площадь 0,1302 га, кадастровый номер 624800000001005032. 3. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005033. Право постоянного пользования. 4. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005034. 5. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005035. 6. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005036. 7. Площадь 0,0027 га, кадастровый номер 624800000001005037. 8. Площадь 0,1324 га, кадастровый номер 624800000001005038. Право постоянного пользования. **Начальная цена** – 2 495 299,65 бел. руб. с НДС. **Задаток** – 250 000,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %

**Аукцион состоится 30.10.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 30.10.2019 (ЗАО «Отдых-2010», Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 28.10.2019 в 11.00. Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 02.07.2019

☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 ● www.ino.by ● e-mail: **torgi@ino.by**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Чайка» (г. Гродно, пер. Дзержинского, д. 21) 22 октября 2019 года

| Вид аукциона открытый | Лот № 1* |
|---|---|
| Предмет аукциона | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-86693 – здание административно-хозяйственное (административное здание) общей площадью 384,8 кв. м. Год постройки – 1966 |
| Начальная цена продажи | **141 000,00 рубля**<br>(с учетом НДС 20 %) |
| Кадастровый номер земельного участка и размеры | 440100000002005393,<br>0,0366 га |
| Месторасположение земельного участка | г. Гродно,<br>пер. Дзержинского, д. 21 |
| Имущественное право земельного участка | Право постоянного пользования |
| Продавец | Открытое акционерное общество по химической чистке одежды и стирке белья «Чайка»,<br>г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел. 8(0152)607302, 745502 |
| Сумма задатка | 7 050,00 рубля |
| Организатор аукциона | Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»,<br>г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел. 720537, 720010. |
| Дата проведения аукциона | 22 октября 2019 года |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 |
| Дата и время начала приема документов | 7 октября 2019 года, 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 16 октября 2019 года, 17.00 |

* – объект обременен договорами аренды.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by, gcn.by**

Утерянные представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №№ 2757450 **считать недействительными** УНП 100122726

## Извещение о проведении 29 октября 2019 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

| Предмет торгов |
|---|
| легковой специальный седан SAAB 9.5, год выпуска – 1998, регистрационный знак 5885 ЕН-5, инвентарный номер 2391 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК |
| Начальная цена: 1 860,41 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 500,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **29 октября 2019 года** в **16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 04.10.2019 по 28.10.2019** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(033) 333-80-52 (ОАО «ДСТ № 7»)

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует:**

В извещение о проведении электронных торгов по продаже имущества ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», опубликованном в газете «Звязда» от 26.09.2019, вносится изменение:

1. Марка, модель лота № 9 – **МАЗ-5337-КС 3579;**
2. Инв. номер лота № 12 (**МАЗ-533702-2140,** автокран, 5739ЕС, 2003 г. в.) **– 100000021827**;
3. Начальная цена лота №18 (**ГАЗ-2752**, фургон, АВ 7877-7, 2007 г. в.) **– 2 640,00 бел. руб. ;**
4. Начальная цена лота №19 (**ГАЗ-33081**, фургон-мастерская, АА 2216-7, 2005 г. в.) **– 7 560,00 бел. руб.**

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

УНП 191021390

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-14, 8 (029) 510-07-63.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР», 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81 тел.: 8 (0212) 55-11-81, 8 (044) 5941732.

**Лот № 1**. Изолированное помещение с инв. № 200/D-122150, площадью 403,7 кв. м, назначение – производственное помещение, наименование – производственное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-4. Нач. цена: 8 386,81 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 838,68 бел. руб.

**Лот № 2**. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163118, площадью 303,5 кв. м, наименование: бытовые помещения, назначение: помещение неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-11а. Нач. цена: 12 918,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 1 291,80 бел. руб.

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163116, площадью 584,6 кв. м, наименование: административное помещение, назначение: административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/ 19-11б. Нач. цена: 26 971,72 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 2 697,17 бел. руб.

**Лот № 4.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163119, площадью 555,1 кв. м, наименование: бытовые помещения, назначение: помещение неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-11. Нач. цена: 20 699,17 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 2 069,91 бел. руб.

**Лот № 5**. Изолированное помещение с инв. № 200/D-123350 площадью 161,8 кв. м, наименование: административное помещение, назначение: административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе,81/19-14. Нач. цена: 5 293,84 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 529,38 бел. руб.

**Лот № 6**. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163107, площадью 330,4 кв. м. наименование: административное помещение, назначение: административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16. Нач. цена: 13 510,24 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 1 351,02 бел. руб.

**Лот № 7**. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163111 площадью 265,5 кв. м. наименование: административное помещение, назначение: административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16в. Нач. цена: 10 862,07 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 1 086,20 бел. руб.

**Лот № 8.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163108 площадью 37,7 кв. м, наименование: административное помещение, назначение: административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16а. Нач. цена: 1 535,98 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 153,59 бел. руб.

**Лот № 9**. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163109 площадью 142,3 кв. м, наименование: административное помещение, назначение: административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16б. Нач. цена: 5 818,09 бел.руб. без учета НДС. Задаток: 581,80 бел. руб.

**Лот № 10**. Изолированное помещение с инв. № 200/D-184038 площадью 556,7 кв. м, наименование: производственное помещение, назначение: производственное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-19. Нач. цена: 16 807,23 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 1 680,72 бел. руб.

**Лот № 11.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-186394 площадью 409,7 кв. м, назначение – складское помещение, наименование – склад, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/4-1. Обременение: договор аренды сроком до 17.01.2024. **Нач. цена:** 48 450,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 4 845,00 бел. руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 18.10.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 03.10.2019 с 08.30 по 17.10.2019 до 17.30. Изолированные помещения расположены на земельном участке с кадастровым № 240100000001002628 (общая долевая аренда). Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 09.04.2019, 27.04.2019, 15.06.2019, 24.08.2019, 29.08.2019, 19.09.2019

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Условия аукциона: Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по подготовке документации на р/с, указанный в протоколе аукциона, подписать договор купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплатить за объект в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи объекта. **Аукцион проводится** в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (44) 5941732

Общество с ограниченной ответственностью «КОБАС», регистрационный № 100164662, реорганизуется в форме выделения из него общества с ограниченной ответственностью. Претензии кредиторов принимаются по адресу : ул.Чижевских, д. 23, комн. 5, 220028, г. Минск

Свидетельство о государственной регистрации, печати и штампы частного торгового унитарного предприятия «Вудсейл» (юридический адрес: 220090, г. Минск, тр. Логойский, д. 22а, пом. 171, офис 2; УНП 192336303) считать недействительными

Арына ГАРДЗЕЙ

# КРАМА З НЕПРЫГОЖЫМІ ВАВЁРКАМІ



**Выпускніца журфака БДУ, лаўрэат конкурса маладых літаратараў «Першацвет», друкуецца ў часопісах «Полымя» і «Маладосць». Іншае пра сябе Арына не апавядае: «Пра іншае тэксты раскажуць лепш».**

У кніжнай краме, якая стаіць праз пару кварталаў ад цэнтра горада, ніколі не вадзілася прыгожых вавёрак. На дзіва, у ёй не вадзілася і пакупнікоў, толькі часам нехта забрыдаў, заблытаўшыся ў снягах ці заблукаўшы ў тумане. Забрыдаў, слізгаў вачыма па кнігах у старамодных вокладках, страсаў з сябе сняжынкі і холад, каб зноў пайсці ў туман і больш не вяртацца. Не вяртацца ў пыльную залу, дзе рэшткі сонечных промняў, працэджаныя праз жалюзі, з'яўляюцца хіба што па святах. Але гэта падабаецца маладой прадаўшчыцы, як падабаецца ёй танцаваць у адзіноце на шэрым у белую крапінку граніце, акуратна пераступаючы з квадрата ў квадрат...

*We passed upon the stair*
*We spoke of was and when*
*Although I wasn't there.*

Затое непрыгожых вавёрак у краме хоць гаць гаці. Яны стаяць у аддзеле з канцылярыяй, зробленыя невядома кім, невядома навошта, і глядзяць на адны і тыя ж кніжкі крыва прыклеенымі вачыма. Побач з імі такія ж нязграбныя кацяняты нязменна пільнуюць ручкі, лінейкі і алоўкі. Зрэдку іх жыццё весялее: у краму завітвае якаянебудзь мама з дзіцёнкам, якому так шкада гэтых маркотных цацак, што слёзы наварочваюцца.

«Ну навошта табе гэтае непаразуменне?»

*He said I was his friend.*

«Не нудзі! Ты паглядзі, якая яна непрыгожая, фу. Футра куртатае тырчыць у розныя бакі, вочы крывыя, іх нават прыклеілі не там, дзе яны павінны быць. Хадзем. Не нервуй мяне!»

«Ну ма-а-а-а...»

*Which came as a surprise.*

«Паглядзіце, калі ласка, у нас ёсць яшчэ кацяняты. Мо нехта з іх спадабаецца?»

«Здзекуецеся?! Я не хачу нанесці свайму дзіцяці псіхалагічную траўму! І музыку сваю цішэй зрабіце! Працуеце абы-як і абы-што прапануеце!»

А прапанаваць больш і не было чаго.

Грукнулі дзверы. І зноў у цішыні пераступаюць з пліткі на плітку хударлявыя ногі ў танных гумовых шлёпанцах...

*I thought you died alone*
*A long long time ago, —*

ціха падпявае тонкі голас, і дзяўчына кружыцца, кружыцца па пустой зале, прыгожа абмінаючы запыленыя старажытныя стэлажы.

* * *

У краму нават новыя кнігі паступалі з тоўстым слоем пылу. У выдавецтвах маглі бажыцца, што нічога стагоддзямі не ляжала на складзе і ніякай старой макулатуры яны не пастаўлялі. Па шчырасці, гэтым ніхто не цікавіўся: кнігі прывозілі, тыя не прадаваліся, іх адвозілі назад у выдавецтва, але адрас крамы з непрыгожымі вавёркамі чамусьці гублялі сярод іншых кніжных, і пра гэтыя партыі больш ніхто не згадваў. Як ні спрабавала прадаўшчыца датэлефанавацца, колькі ні паварочвала празрысты дыск на жоўтым тэлефоне, колькі ні трымала цяжкую трубку — ніякага адказу.

*Oh no, not me*
*I never lost control, —*

зноў падпяваў тонкі голас, гаварыць якому даводзілася значна радзей.

Прадаўшчыцы не было шкада экспанатаў, сярод якіх трэба было жыць, яна не клапацілася пра іх таварны выгляд. Адзінае, чаго было да слёз шкада, — недарэчных цацак сярод пластыкавых ёмістасцяў з ручкамі і алоўкамі. Спачатку непрапарцыянальныя плюшавыя коцікі з няроўнымі роцікамі пужалі, а вавёркі страшна блішчэлі вачыма ў адзін бок. Але праз колькі часу гэта стала здавацца мілым, і штодня дзяўчына чысціла ад пылу вавёрак, а кацянят аддавала рэдкім пакупнікам быццам у падарунак.

* * *

«Вы сапраўды лічыце, што мне трэба іх купіць?»

*I laughed and shook his hand.*

«Якасць футра добрая, афарбоўка незвычайная. Паглядзіце, якія яны насамрэч прыгожыя».

«Калі перавярнуць прыгажосць дагары нагамі».

«Вы можаце паглядзець кнігі. Магчыма, нешта зацікавіць вас. У нас вялікі выбар выданняў, ад белетрыстыкі да інтэлектуальнай літаратуры».

«Не, мяне не цікавяць сярэднявечныя фаліянты. Давайце вашых вавёрак».

«Усіх?!»

*And made my way back home.*

«Ну так, іх тут усяго пяць штук. Адпушчу іх, няхай жывуць. Можа, і вам стане прасцей, не трэба будзе пра іх клапаціцца. Бо шкада і вас, і вавёрак гэтых страшных. Мне здаецца, што яны — адзінае, за чым вы тут сочыце. Нават за сабой так не сочыце».

«А навошта? Мне здаецца, што я тут жыла заўсёды. Але гэта ўжо, ведаеце, прафесійнае».

«Магчыма, але пра сябе не забывайце, вы ж такая маладая. І прыемная ў вас тут музыка».

Грукнулі дзверы. Маленькая фігурка адразу ж падхапілася і пачала кружыцца яшчэ хутчэй, і хутчэй, і хутчэй, ужо не клапоцячыся пра тое, каб не перакуліць які стэлаж.

*I must have died alone*
*A long, long time ago.*

* * *

Незразумела, навошта было купляць гэтых вавёрак? Гэта ж жах, а не цацкі. Быццам я такое дадому панясу... Дзяўчынку шкада, сядзіць там, як мярцвячка. Страшна, ці жывая яна там увогуле. Трэба будзе іх зараз у парку на лаўку пасадзіць, няхай сабе сядзяць, мо хто-небудзь возьме. Вярнуся, куплю якую-небудзь кніжку, каб хоць які прыбытак зрабіць...

Так мармытаў чалавек, расшпільваючы спартыўную торбу. Пальцы на марозе слухаліся кепска, але ён адчуў, што да рук дакранаецца нешта незвычайна цёплае.

«Забыў шалік дастаць?»

Аднак у прарэзе паказаліся спачатку дзве рудыя лапкі з танюсенькімі кіпцікамі, потым яшчэ дзве і яшчэ. Праз імгненне на торбе перад мужчынам сядзела самая звычайная і самая жывая вавёрка: цемнаватыя вушкі, маленькі прыгожы носік, пухнаты, рыжы, з карычневымі крапінамі хвост, і маленькія чорныя бліскучыя вочкі. Яшчэ імгненне — на торбе ўжо пяць вавёрак, якія зацікаўлена сочаць за расчырванелымі чалавечымі рукамі — раптам у іх знойдуцца арэшкі?

* * *

Разгублены чалавек бег да крамы. Бег марудна: ногі гразлі ў снезе, і страшна было нашкодзіць вавёркам у торбе, калі бегчы хутчэй.

«Вы што мне прадалі?..»

Вуліца стала яшчэ больш заснежанай, ніхто нічога расчышчаць не збіраўся. Сумёты зрабіліся вялізнымі, усё раслі і раслі.

«А што такое?»

Недзе ўбаку згубілася сцежка, толькі здзіўлены чалавек з перакошаным тварам зусім не звяртаў на гэта ўвагі.

«Вы што мне прадалі?!»

Ён шукаў кніжную краму са старымі кнігамі і непрыгожымі плюшавымі вавёркамі, шукаў невялікую залу з квадратамі граніту на падлозе, шукаў залу, шчыльна застаўленую стэлажамі, шукаў маладую прадаўшчыцу і прыемную песню...

«А што можа быць з гэтымі няшчаснымі плюшавымі вавёркамі?! Дык пакажыце, калі ласка, што там не так?»

І знайшоў.

«Чаго?! Эм-м-м, выбачайце... Нешта мне здалося... Усё з імі ў парадку... Неяк вельмі натуральна яны ў вас зробленыя».

*Who knows?*
*Not me.*
*We never lost control.*

Каля крамы самотна стаялі сумёты, тры дрэвы і лаўка.

«Нічога, бывае. Заходзьце яшчэ».

«Ага... Абавязкова».

* * *

Пазней, каля дома, чалавек ужо супакоіўся пасля дзіўнага здарэння і адкрыў торбу, каб дастаць ключы. Але нешта зноў падазрона ў ёй заварушылася. Чалавек зусім збялеў. З сумкі высыпаліся тыя самыя жывыя вавёркі і хутка разбегліся па дрэвах. Ву-у-нь яны сядзяць, з цікаўнасцю сочаць — раптам яшчэ што цікавае выпадзе?

«Па кніжкі туды нізавошта... І што гэта такое?» — зусім разгублена запытаўся ў цішыні чалавек.

Ніхто, акрамя ветру, не адказаў. Аднак што ён адказаў? Хутчэй, падвыў песню, якую слухалі на вялікай гучнасці недзе ў доме побач, напэўна, на паверсе першым, а можа і вышэй:

*You're face to face*
*With...*

Ганна КОМАР

# ЛІСТ ДА ЧАРЛЬЗА БУКОЎСКІ

«Дзетка, калі ты хочаш, ты будзеш тварыць...»

Ты меў рацыю, Чарльз.

Кнігу тваіх вершаў па-беларуску ўкладала як гайдбук для пісьменнікаў. Хіба я магла ўявіць, што праз пяць гадоў пасля таго самага верша пра тое, як «святло, і паветра, і месца, і час не змяняюць нічога і не ствараюць нічога», яна найперш спатрэбіцца мне самой?

У адным літаратурным блогу, дзе чытачка ў лісце жалілася на дэпрэсію і нізкую самаацэнку, якія замінаюць ёй пісаць, хоць яна і адчувае ў сабе вялікі патэнцыял і талент, аўтарка адказвала ёй так: «Ты ж не лічыш, што шахцёры цэлымі днямі стаяць і скардзяцца на тое, як цяжка ім? Яны проста ПРАЦУЮЦЬ!»

Я таксама многа жалюся на тое, як не магу пісаць, Бук. Шукаю адмазкі — у недахопе часу і сіл. У дэпрэсіі. У гіпавітамінозе. Вінавачу боль за тое, што ён занадта моцны. На адным пластычным спектаклі я назірала за танцорамі, за іх натрэніраванымі гнуткімі целамі, што так, здавалася, лёгка рабілі патрэбныя рухі. Тыя танцоры таксама, як і шахцёры, не скардзяцца — яны працуюць.

Чаму скарджуся я? Шукаю камфорту. Заспакаення. Шукаю бяспекі. Пастаянства. Шукаю кропку, з якой нікуды не трэба рухацца. Я хачу спыніцца ці думаю, што хачу? А ці магу? Што забівае мяне, Бук, і чаму мяне забівае не тое, што я люблю? Што, калі я хачу памерці ў паэтычным экстазе, ад передазу метафар, на самай нечаканай рыфме? Ці думаю, што хачу? А магу?

Смерць — гэта, можа быць, адзінае, пра што варта пісаць, бо яна ўсё адно дастане цябе, «і не важна, хто ты: пісьменнік, шафёр, сутэнёр, парашутыст, мяснік — яна дастане цябе». Толькі не адразу. Спачатку яна прыходзіць па нашых блізкіх. Ты чакаў яе, «бы котку, што скочыць на твой ложак». А яна знянацку наскоквае ў твар, упіваецца кіпцюрамі і раздзірае, як згаладалая рысь.

Гэтая раптоўнасць пужае найболей. Смерць блізкіх — крэйдавы крыжык на маіх дзвярах. Раптам так вусцішна робіцца, што нават напісаць пра гэта не магу. Проста быць побач з блізкімі, з каханымі. Выбіраю самага цудоўнага з прэтэндэнтаў і перапампоўваю ў яго сваё жыццё, каб смерці, калі яна прыйдзе за мной, не было чым паласавацца. Вось толькі што, калі яго смерць забярэ першым?

Боль не апраўдвае бяздзеяння. Боль — гэта яшчэ адна адмазка. Пазбяганне выбару і адказнасці за яго. Стаю, утаропіўшыся ў крыжык, пазначаны крэйдай на дзвярах.

У маёй любімай венгерскай народнай казцы старая абхітрыла Смерць. Калі тая прыйшла па яе, старая папрасіла адтэрміноўкі да заўтра і ўгаварыла Смерць уласнай рукой напісаць на дзвярах хаты: «Заўтра». Кожны наступны дзень тая прыходзіла і сыходзіла ні з чым, бо старая кожны раз указвала ёй на слова «заўтра». Смерць-такі не вытрымала, сцерла надпіс і паабяцала прыйсці назаўтра і дакладна забраць старую з сабой. На наступны дзень жанчына, шукаючы, дзе схавацца, спачатку залезла ў бочку з мёдам, пасля паспрабавала зашыцца ў пярыне, а калі вылезла, каб схавацца яшчэ лепш, Смерць акурат увайшла ў хату — пабачыла тое страхоцце, напужалася і больш не прыходзіла.

Ты таксама «змахляваў», Бук, ты «выйграў свае грэбаныя пяць хвілін і нават больш».

Можа быць, у гэтым і ёсць увесь сэнс — пакуль я пішу, на маіх дзвярах свеціцца слова «заўтра». І ты зноў меў рацыю: «Мы пераможам смерць».



**Аўтарка, якая друкуецца ў «Маладосці» з кароткімі трапнымі замалёўкамі з жыцця, гаворыць пра сябе так: «Калі я пішу, я не ўцякаю ад жыцця, а пражываю яго. Гэта як затрымацца каля яблыні ў квецені ці запаволіцца, адчуўшы пах бэзу. Гэта і спроба не пытаць «навошта?», а зразумець, дзеля чаго. Спыніць момант. Павярнуцца тварам да страху. Стварыць тую самую маю гісторыю».**

SEX=БАЛЯСЫ

# ПУНКТ НЕЗВАРОТУ

**Ці чулі вы пра Сусветную дату дня экалагічнага доўгу? («— Як даўно ў вас былі сексуальныя зносіны?... Хопіць плакаць, паспрабуйце прыгадаць...») Гэта той дзень у годзе, калі чалавецтва канчаткова выдаткоўвае на свае патрэбы ўсе аднаўляльныя рэсурсы, якія планета можа «выдаць» за гэты самы год. («Гінеколаг: — Вы толькі што нарадзілі і зноў на ўлік? Вы што, пасля радзільнага дома — адразу ў ложак? — Не... Спачатку боршч зварыла...») Пасля мы пачынаем спажываць тое, што прызначалася на наступны. Па падліках эколагаў, у свеце прыродныя запасы выкарыстоўваюцца ў 1,7 раза хутчэй, чым іх можа аднавіць Зямля. Выходзіць, чалавецтва пакрысе пачынае жыць «у доўг», забіраючы тое, што прызначалася будучым пакаленням. Але і такое не можа працягвацца бясконца: дата экалагічнага доўгу з кожным годам на розных тэрыторыях надыходзіць усё раней... («Па статыстыцы, на кожнага мужчыну старэй за 85 гадоў прыпадае па сем жанчын. Але позна... Занадта позна...»)**

Іншымі словамі, чалавецтва праходзіць пункт незвароту — крытычную мяжу, рубеж, пасля якога немагчыма вярнуцца да зыходнага стану. («Адчуваю сябе як апошняя цукерка ў вазе: усе хочуць, але ніхто не бярэ».) Уявіце, напрыклад, што самалёт можа праляцець тысячу кіламетраў. Калі над сваёй тэрыторыяй да наступнага аэрадрома — няма пытанняў. А калі трэба за лінію фронту? Ён зможа выкарыстаць рэсурс максімум напалову, інакш не дацягне да базы. Кожны лішні кіламетр «туды» будзе змяншаць шанцы вярнуцца «назад». («Дзяўчына расказвае пра свайго новага хлопца: — А заляцаецца як прыгожа! Якія словы знаходзіць! Якія кветкі дорыць! Вось хоць ты ніколі за яго замуж не выходзь!»). Але яшчэ да надыходу ўсеагульнай катастрофы мы пачалі пераходзіць той самы пункт незвароту. У гендарным сэнсе у стасунках паміж мужчынамі і жанчынамі...

Ужо неяк пісаў, што гады два таму ў Брытаніі вырашылі: адзенне школьнікаў павінна быць аднолькавым для ўсіх. Таму хлопчыкам можна насіць спадніцы або сарафаны, а дзяўчынкам — штаны. Дык вось вам свежая навіна! Нядаўна ў школе горада Льюіса ва Усходнім Сасексе ўвялі правіла (зноў жа дзеля забеспячэння гендарнай нейтральнасці, як жа без гэтага?!): усе вучні незалежна ад полу павінны хадзіць у штанах. Што было далей? Каля сотні школьніц не пагадзіліся з гэтым, і кіраўніцтва навучальнай установы... выклікала паліцыю, каб не даць ім увайсці ў будынак. («— А ты навучыш мяне рабіць тое, што нельга? — Табе колькі гадоў? — 14. — Даставай сшытак і ручку. Зараз будзем дзяліць на нуль».)

Затое ў Італіі мужчын заклікалі насіць... дамскія сумкі. («Сышоў у сябе, а там жонка сустракае».) Хэдлайнерамі шоу ад тамтэйшага моднага дома Fendi і японскага вытворцы чамаданаў Porter сталі



жаночыя мадэлі Baguette і Peekaboo — упершыню перавыпушчаныя для моцнай паловы чалавецтва. («Вельмі люблю гэты ўзровень блізкасці з мужчынам, калі яму можна задаваць патаемныя пытанні: «Чаго ты баішся?», «Чаго па-сапраўднаму хочаш?», «Які пін-код тваёй банкаўскай карткі?»)

Японцаў вышэй згадаў нездарма. Там такое творыцца... На фоне патэнцыйнага дэмаграфічнага крызісу з-за распаўсюджвання секс-робатаў 35-гадовы Акіхіка Канда ажаніўся з... галаграмай камп'ютарнага персанажа. («— Ты больш любіш мяне ці суп? — Першае».) Пісалі, што вяселле абышлося ў 18 тысяч долараў, было сорак гасцей. Паколькі пацалаваць віртуальную абранніцу японец не мог, на ўрачыстасці яна «з'явілася» ў выглядзе плюшавай версіі. («Малады чалавек праз камп'ютар спрабуе знайсці жонку. Ён хоча, каб яна была брунеткай, невялікага росту, сціпла адзявалася, была таварыскай і добра плавала. Камп'ютар пасля пэўных роздумаў выдае рэкамендацыю: «Вам падыходзіць самка пінгвіна».) А памятаеце яшчэ, як адзінокія мужчыны ў Краіне ўзыходзячага сонца выступілі супраць закаханых парачак? («— Я не карыстаюся поспехам у жанчын. — Чаго ты заліваеш? Вакол цябе бабы так і ўюцца. — Не, ну поспех, канешне, ёсць. Гавару ж: я ім не карыстаюся».) Не ўсіх цалкам, а тых, хто на людзях дэманструе свае пачуцці. («Я гадамі выпрацоўваў дрэнную рэпутацыю, мярзотны характар, быў жорсткі, усе мяне ненавідзелі. І тут раптам з'яўляецца нейкая баба, і ўсё — я «зая».) Пратэстуючыя нават выходзілі на мітынг з плакатамі кшталту «Пары, пакайцеся!» («У рамане з замужняй жанчынай галоўнае, каб яна не развялася».)

Мабыць, «дзякуючы» ўсяму вышэйпрыведзенаму (а гэта далёка не поўны пералік) Ватыкан выпусціў дакумент на трыццаці старонках пад красамоўнай назвай «Ён стварыў іх мужчынам і жанчынай». У ім жорстка раскрытыкаваная сучасная канцэпцыя гендарнай ідэнтычнасці, прынятая ў многіх краінах. («У маім суровым дзяцінстве батут быў з жалеза. Хто ведае, той зразумее».) Даклад выдадзены ў якасці дапаможніка для тых, хто працуе з дзецьмі. Там, у прыватнасці, гаворыцца, што пераменная сексуальная ідэнтычнасць часта заснаваная толькі на «сумнеўным разуменні волі на аснове пачуццяў і жаданняў». У дакуменце адзначаецца, што сучасны падыход да гендарнай ідэнтычнасці знішчае канцэпцыю прыроды і дэстабілізуе інстытут сям'і. («Як рамантычна было ў сярэднія вякі: пояс вернасці, замочак кахання, напільнік надзеі...») Ачомацца б, пакуль канчаткова не стала позна...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «САМАЕ ДЗЁРЗКАЕ ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Вы працавалі гукарэжысёрам на радыёстанцыях «Сталіца», «Юністар», «Бі-Эй», «Мінская хваля». Ні ў каледжы, ні ва ўніверсітэце асновы гукарэжысуры не выкладаюцца. Дзе вучыліся, адточвалі сваё майстэрства?***

— Яшчэ студэнтам я бачыў, як імкліва развіваецца музычная культура. Разумеў, што ўменняў, якія даюць навучальныя ўстановы, недастаткова для поспеху. Гукарэжысура, сапраўды, ні ў каледжы, ні ва ўніверсітэце не выкладалася. Але я шукаў літаратуру, раіўся са старэйшымі калегамі... Безумоўна, мне вельмі дапамаглі велізарныя архівы «Ютуба». А ўвогуле я — вечны вучань, вечны навічок. Кожны раз, беручыся за новую работу, разумею, што зноў трэба пачынаць спачатку, зноў трэба вучыцца. Без самаадукацыі прафесіяналу не абысціся.

***— Як тэатральны кампазітар вы дэбютавалі ў тэатры імя Янкі Купалы ў пастаноўцы Аляксандра Гарцуева «Людзі на балоце», а сёння на сцэне Тэатра беларускай драматургіі ваша музыка гучыць у гарцуеўскіх жа спектаклях «Тры Жызэлі», «Пелікан», «Сірожа». Памятаеце, як пазнаёміліся з майстрам?***

— Я тады якраз працаваў на радыё «Юністар». Аляксандр Гарцуеў удзельнічаў у адной з нашых праграм. Пасля запісу я расказаў пра сябе — пра адукацыю, пра свае сачыненні, пра вопыт дырыжыравання — і прапанаваў штосьці напісаць для тэатра. Безумоўна, Аляксандр Фёдаравіч мог бы скептычна ўспрыняць такую смелую прапанову, але майстра зацікавіўся і папрасіў паказаць некалькі накідаў. На вялікае шчасце, яму спадабалася, і ён адразу ж запрасіў мяне аформіць пастаноўку «Людзі на балоце». Адказнасць была велізарная: такі твор, ды яшчэ на сцэне Купалаўскага! Але, як мне здаецца, я справіўся няблага. Супрацоўнічаць з тэатрамі для мяне — вялікая радасць. Але так сталася, што апошнім часам не паспяваю адсочваць, як праяўляюць сябе ў тэатры мае калегі: нядаўна я стаў бацькам двайнят, і на прэм'еры ў мяне пакуль не стае часу.

***— А прывядзіце, калі ласка, прыклады ўдалага, на ваш погляд, музычнага афармлення фільмаў...***

— У кінамузыцы спецыфіка такая: музычная тэма мусіць задаваць тон, ствараць атмасферу, перадаваць настрой карціны, і ў той жа час яна не павінна раздражняць, адцягваць увагу. Некаторыя рэжысёры ўдала выкарыстоўваюць кампіляцыю вядомых музычных твораў. Як прыклад — «Змрок» Кэтрын Хардвік. Спецыяльна для фільма была напісана толькі адна фартэпіянная тэма, астатняе — трапна падабраныя песні славутых гуртоў... Мне вельмі падабаецца, як піша для кіно Алан Менкен. Цудоўна працуе Дэні Эльфман: аформленая ім карціна «Кашмар перад Калядамі» — выдатны прыклад фільма-мюзікла. Шыкоўная музыка ёсць і ў Раміна Джавадзі: думаю, многія ведаюць яго трэкі да фільмаў «Жалезны чалавек», «Свет дзікага Захаду» і, безумоўна, «Гульня тронаў». Пасля прагляду згаданых карцін яшчэ доўга памятаеш і музыку — а гэта так каштоўна.

***— Шосты год вы ўваходзіце ў незалежнае творчае аб'яднанне «Без Буслоў Артс», якое скіравана на стварэнне і прасоўванне фільмаў. Як вы, прафесійны музыкант, прыйшлі да думкі стаць кінапрадзюсарам?***

— Аднойчы, седзячы ў кавярні, мы з рэжысёрам Андрэем Курэйчыкам загаварылі пра тое, што на беларускае кіно наракаюць усе: публіцы няма чаго глядзець, акцёрам няма дзе здымацца, а ў пастаноўшчыкаў няма сродкаў, за што здымаць. І падумалі: а чаму б нам проста не паспрабаваць стварыць сваё кіно? Так, як можам. Так, як адчуваем. З'явілася ідэя зрабіць фільм пра аўтасэрвіс. Знайшлі гараж — і праблема з дэкарацыямі была вырашана. Толькі паставіў святло — і пляцоўка для здымак гатовая. Мы з Курэйчыкам скінуліся па дзве з паловай тысячы долараў, і гэтых грошай хапіла на ўсе выдаткі. За чатыры здымачныя змены зрабілі фільм «ГараШ». Карціна была прадстаўлена на кінафестывалі «Лістапад», а пасля выйшла і ў шырокі пракат. На той момант «ГараШ» быў самым камерцыйна паспяховым беларускім фільмам. Важна было даказаць, што і малабюджэтнае кіно можа мець поспех. Цяпер нам, творцам, важна не спыняцца. Сёння "Без Буслоў Артс" схіляецца да стварэння не камерцыйнага, а фестывальнага кіно.

***— Вы пісалі музыку для рэкламы такіх вядомых брэндаў, як Bon Aqua, Coca-Cola, McDonalds, Gefest ды многіх іншых — на рахунку ўжо некалькі соцень агучаныхролікаў. У чым тут спецыфіка?***

— Хачу сказаць, што тэрміны работы над рэкламнай музыкай вельмі кароткія. Часта мне тэлефануюць з агенцтва, тлумачаць, што трэба зрабіць, а назаўтра я ўжо здаю заказ. Хуткасць — адно з галоўных патрабаванняў да кампазітара, які працуе ў гэтай сферы. Але часам бываюць праекты, якія рыхтуюцца доўга і калектыўна. Напрыклад, аднойчы мяне папрасілі напісаць гімн для футбольнай каманды. Дзеля гэтага запрасілі сімфанічны аркестр і хор, а запіс рабілі ў Доме радыё. Незабыўны заказ! Хачу сказаць, што рэклама — вельмі карысны вопыт. Кожны раз ты працуеш у новым жанры, кожны раз выпрабоўваеш сябе.

***— Для некаторых вы вядомы як Friga — выканаўца аўтарскіх песень. Як вырашыліся пісаць песенныя тэксты па-англійску?***

— З праекта Friga, можна сказаць, і пачалося маё прафесійнае станаўленне як кампазітара. Гэта так званая першая проба пяра. Цяпер бачу свае хібы і ў аранжыроўцы, і ў выкананні — разумею, што многае можна было б зрабіць па-іншаму, лепш. Але Friga — этап, праз які я, малады, мусіў прайсці, няхай і з памылкамі. На пачатку дзейнасці адразу хацеў вызначыцца, хто мая аўдыторыя, для каго я працую. І гэтым пытаннем, дарэчы, раю задацца ўсім навічкам — адказ многае вызначыць. Мне, пачаткоўцу, хацелася, каб творчасць была запатрабавана і за мяжой, таму і пісаў песні па-англійску. З тэкстамі праблем хапала, але, на шчасце, у мяне былі знаёмыя лінгвісты, якія маглі мне штосьці падказаць, выправіць, дапамагчы адпрацаваць вымаўленне. Яшчэ ў свой час мне вельмі пашанцавала з выкладчыцай замежнай мовы ва ўніверсітэце — менавіта ад яе атрымаў асноўныя веды.

***— А якую сваю работу вы лічыце самай смелай, самай дзёрзкай?***

— Нечаканым паваротам у кар'еры стаў аўтарскі праект брата TrockenSaft, які даў мне магчымасць паспрабаваць сілы ў электроннай музыцы. Дзіўны вопыт! Але самае дзёрзкае яшчэ наперадзе: даўно я думаю пра тое, каб напісаць оперу. Трэба ўжо нарэшце сабрацца з сіламі!

**Марыя СТРАХ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 02.10.2019 г.

# ПРА ШТО МАЎЧАЦЬ СТАРАЖЫТНЫЯ КУРГАНЫ

## У Магілёве можна ўбачыць унікальныя археалагічныя знаходкі

**Анатоль Седзін — археолаг з болей чым 30-гадовым стажам, вучоны сакратар абласнога краязнаўчага музея імя Еўдакіма Раманава. Пра любімую справу можа расказваць гадзінамі, гісторыяй захапляецца з дзяцінства. Нават падлічыць цяжка, колькі часу ён правёў у археалагічных экспедыцыях. Іх вынікам сталі больш за сотню навуковых артыкулаў і дзве кнігі. Важнасць яго даследчай і асветніцкай работы ацанілі на высокім узроўні: Анатоль Аляксеевіч атрымаў грант Прэзідэнта, які стаў адзнакай работы і стымулам для далейшых даследаванняў. Падрыхтаваная ім выстаўка «Жалезны век і ранняе Сярэднявечча Усходняй Беларусі» (яна будзе працаваць амаль да канца гэтага года) — па сутнасці, дэманстрацыя ўсяго таго ўнікальнага, што было знойдзена на працягу апошніх гадоў. Па словах Анатоля Седзіна, Магілёўшчына — сапраўдная скарбніца старажытных каштоўнасцяў. Шмат у чым так сталася дзякуючы асабліва паўнаводнай у эпоху Сярэднявечча рацэ Дняпро. Менавіта ўздоўж Дняпра ішло перамяшчэнне і рассяленне плямёнаў.**



У музеі захоўваецца самая вялікая калекцыя пальчатых фібул.

### Прачытаць код нацыі

Такога разнастайнага і багатага матэрыялу, напэўна, няма ні ў адной іншай вобласці Беларусі. На поўначы, напрыклад, жылі ў асноўным крывічы, на Гомельшчыне — радзімічы. А магілёўскія землі сталі прытулкам для розных плямёнаў. Тут засталіся паселішчы і крывічоў, і радзімічаў, і дрыгавічоў, якія насялялі Падняпроўе, пачынаючы з VIII стагоддзя. У Слаўгарадскім раёне налічваецца больш за 200 помнікаў археалогіі. Непадалёк ад Блакітнай крыніцы ёсць стаянкі каменнага і бронзавага вякоў, славянскія паселішчы. Мясціны проста ўнікальныя і амаль не кранутыя археолагамі — у прыватнасці, таму, што забруджаныя чарнобыльскім попелам. Але, як сведчаць спецыялісты, у зямлі старажытныя прадметы таксама нядрэнна захоўваюцца. А з часам, магчыма, з'явяцца прыборы, з дапамогай якіх падземныя багацці можна будзе праглядаць, нават не падымаючы іх на паверхню.

Археалагічныя фонды абласнога краязнаўчага музея налічваюць 27 тысяч прадметаў асноўнага і каля 119 тысяч навукова-дапаможнага матэрыялу. Гэта адна з найвялікшых калекцый у нашай краіне. Магілёву заўсёды шчасціла з археолагамі: Міхась Ткачоў, Леанід Аляксееў, Леанід Побаль, Вячаслаў Капыцін зрабілі вялікі ўнёсак у агульную справу. Старажытнае мінулае Магілёўшчыны вывучалася на працягу шматлікіх гадоў. Музей носіць імя выдатнага вучонага, даследчыка Еўдакіма Раманава, які, дарэчы, таксама быў археолагам.

— На жаль, яго матэрыялы не захаваліся, — уздыхае суразмоўца. — Як і даваенная калекцыя музея. Але пачынаючы з пасляваеннага часу музей пастаянна праводзіў археалагічныя даследаванні і сіламі сваіх супрацоўнікаў, і ў складзе тых экспедыцый, якія сюды прыязджалі.

У музеі ёсць вялікая стацыянарная экспазіцыя па археалогіі, якая створана больш за 20 гадоў таму. І хоць яе экспанаты перыядычна мяняюцца, паказаць усё, што ёсць у запасніках, немагчыма. Выстаўка «Жалезны век і ранняе Сярэднявечча Усходняй Беларусі» дала шанц убачыць тыя багацці, якія дагэтуль наогул не выстаўляліся. Гэтымі прадметамі нельга не захапіцца. Бо яны — своеасаблівы наш радавод, код нацыі, інфармацыя пра тое, якімі мы былі амаль дзве тысячы гадоў таму.

### Край гарадзішчаў і курганоў

Частку гэтых аб'ектаў можна ўбачыць на выставачных здымках. На першы погляд — нейкія пагоркі, парослыя дрэвамі. Але спецыялісты ніколі не пераблытаюць рукатворныя насыпы з прыроднымі. У VII стагоддзі да нашай эры гэта былі непрыступныя валы і магутныя ўмацаванні. За дзясяткі стагоддзяў яны паменшыліся ў памерах, але, калі прыглядзецца, і цяпер уражваюць. Месцамі яны дасягаюць у вышыню пяці і больш метраў.

— Адно з самых прыгожых у вобласці гарадзішчаў знаходзіцца ў вёсцы Міцькаўшчына Мсціслаўскага раёна, — звяртае ўвагу Анатоль Седзін. — Яно абнесена магутнымі валамі, па перыметры якіх стаялі абарончыя сцены. Пад імі ў перыяд вайны або нейкай іншай небяспекі хаваліся людзі.

VII стагоддзе да нашай эры — гэта той самы перыяд, калі з'явілася першая зробленая найпрасцейшымі кавальскімі інструментамі недасканалая прадметы з балотнай руды і крыцы для дому і працы. А хутка больш — магутная зброя.

— Пасля таго як з'явілася жалеза, сталі частымі ўзброеныя сутыкненні і канфлікты, — удакладняе археолаг. — Таму людзі і пачалі ўмацоўваць свае пасяленні равамі і валамі.

На палічках прадметы з тысячагадовай гісторыяй, але некаторыя з іх вельмі падобныя на тыя, якімі мы карыстаемся цяпер. Той жа посуд, халодная зброя, інструмент для апрацоўкі зямлі.

— Яны першапачаткова былі дасканалыя, — канстатуе суразмоўца. — Нашы продкі былі больш дасведчаныя і мудрыя, чым мы. Яны знаходзілі больш гармоніі з навакольным асяроддзем, былі больш універсальныя, шмат чаго ўмелі. Яны не адносіліся да прыроды па-вар'яцку. І нам шмат чаму трэба ў іх павучыцца.



Рэчы са старажытных гарадзішчаў.

На музейных вітрынах каштоўныя ўпрыгажэнні таго перыяду з цікавымі малюнкамі. На тых жа пальчатых фібулах з Нікадзімава мудрагелістыя завіткі, салярныя знакі, галовы розных жывёл.

— Гэта вельмі рэдкія рэчы, — удакладняе суразмоўца. — У 1987 годзе, калі мы знайшлі пальчатую фібулу, яна была адна з першых у Беларусі. На сёння ў нас самая вялікая калекцыя пальчатых фібул.

Вабіць вока шыкоўная калекцыя жаночых упрыгажэнняў з выемчатымі эмалямі. Падковападобныя, трохвугольныя, круглыя — прыгажуні II—V стагоддзя ведалі толк у модзе.

У калекцыі прадметы перыяду ўтварэння ў Верхнім Падняпроўі першых гарадоў — цікавы меч канца IX—X стагоддзяў, скроневае кольца радзімічаў, спражкі, фрагменты шкляных бранзалетаў XII стагоддзя. А яшчэ маленькія кісцяні і булавы, удары якіх маглі быць зусім не бяскрыўднымі для чалавека.

### Таямніцы старажытнага Нікадзімава

Суразмоўца згадвае адно са старажытных месцаў пражывання нашых продкаў — гарадзішча Нікадзімава, якое ён асабіста даследаваў дасканала і грунтоўна. Яно знаходзілася на тэрыторыі сучаснага Горацкага раёна. Умацаванню 1,5 тысячы гадоў, а ў нас ёсць магчымасць убачыць, як яно выглядала. Гісторык напісаў пра Нікадзімава кнігу, якая на першым форуме нацыянальных музеяў Беларусі ў Гродне стала найлепшай сярод выданняў аб музейных прадметах.

— Мы даследавалі больш за тысячу квадратных метраў культурнага слоя, перабралі цэлы эшалон зямлі і знайшлі вялікае мноства розных прадметаў V—VII стагоддзяў, — кажа Анатоль Седзін. — Гэтае ўнікальнае пасяленне самае багатае не толькі ў Беларусі, а і наогул на ўсёй тэрыторыі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Такіх буйных аб'ектаў больш няма.

Даследчыкі высветлілі, што ў Нікадзімаве быў значны адміністрацыйна-тэрытарыяльны цэнтр, тут знаходзілася сядзіба князя і яго дружыны. Пра гэта сведчыць мноства зброі, наканечнікаў стрэл, дзід. А яшчэ тут былі знойдзены рэдкія жаночыя ўпрыгажэнні, бытавыя рэчы, насенне, косткі болей чым 50 жывёл. Усё гэта загінула ў агні пажару. Нікадзімава, як мяркуюць даследчыкі, спалілі качэўнікі.

— Тыя ж трохлопасцевыя наканечнікі стрэл, якія мы знайшлі, былі на ўзбраенні розных плямёнаў, але часцей сустракаліся ў качэўнікаў паўднёвых тэрыторый, — кажа археолаг. — Нехта лічыць, што крыж на гарадзішчы паставілі авары. Але, паўтаруся, гэта толькі здагадкі.

Цікавая знаходка — гнуты двухлязовы меч, самы старажытны на тэрыторыі Беларусі, ён датуецца VI стагоддзем. Многім цяжка разглядзець у гэтым іржавым зламаным кавалку жалеза нешта каштоўнае, але спецыялісты ведаюць цану такім рэчам.

— Вось і я спачатку прыняў яго за скобліў, якой здымаюць кару дрэва, — усміхаецца мой гід. — А калі разгледзеў яго ўважліва, зразумеў, як нам пашчасціла. Такіх артэфактаў наогул у краіне амаль няма. На жаль, другую частку меча не знайшлі, яна, магчыма, і цяпер ляжыць недзе ў зямлі. Такі меч быў на той час вельмі рэдкай і дарагой зброяй. Як і знойдзены там жа самы старажытны на тэрыторыі нашай краіны бранябойны наканечнік стралы. Нам сустракаліся нават фрагменты кальчугі. Уяўляеце, у шостым стагоддзі нашай эры былі ўжо бранябойныя наканечнікі стрэл і кальчугі. Гэта фантастыка.

Гісторык не хавае, што археалагічныя таямніцы нашай зямлі цікавыя для свету.

— У нас ёсць такія старажытныя рэчы, якія ўяўляюць цікавасць для ўсяго чалавецтва, — кажа ён. — Не раз даводзілася бываць на навуковых канферэнцыях у Расіі, Польшчы, іншых краінах. У нас шмат агульнага мінулага, а археалогія — адна з нямногіх навук, якая не дасць сказіць гісторыю. Кожную падзею яна пацвярджае фактычным матэрыялам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**

---

Чулі?!

# У Кітаі з'явіцца пасёлак — копія палаца Радзівілаў

**Пасёлак з беларускім каларытам плануюць пабудаваць у горадзе Чунцын на працягу шасці месяцаў. Пра гэта расказаў сакратар партыйнага камітэта Камуністычнай партыі Кітая Тан Чуань падчас сустрэчы з дэлегацыяй Мінскай вобласці, якая знаходзілася з дзелавым візітам у гэтай краіне.**

На рэалізацыю праекта плануецца патраціць каля 40 мільёнаў долараў. Комплекс размесціцца на плошчы 240 гектараў на тэрыторыі дзяржаўнага сельскагаспадарчага тэхнапарка.

— Гэта будзе пакуль адзіны турыстычны комплекс з беларускім каларытам, — сказаў Тан Чуань. — Мы спадзяёмся, што гэты ўнікальны аб'ект стане пляцоўкай для размяшчэння, у тым ліку, беларускіх сельскагаспадарчых прадуктаў.

Прататыпамі забудовы і ландшафтных мадэляў пасёлка выступаюць архітэктурныя аб'екты Мінскай вобласці. Напрыклад, тут з'явіцца дакладная копія палаца Радзівілаў. Нядаўна кітайскія спецыялісты наведалі Нясвіж, дзе дасканала вывучылі архітэктурныя асаблівасці палаца.

Беларускі бок, у сваю чаргу, дапаможа замежным калегам з культурным напаўненнем аб'екта. На тэрыторыі комплексу плануецца размясціць вялікую сцэну, дзе будуць ладзіцца канцэрты, у тым ліку і беларускіх калектываў. Кітайскі бок таксама запрасіў падключыцца да ўдзелу ў праекце мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Валянціна Елізар'ева. Пра гэта паведаміла «Звяздзе» **прэс-сакратар Мінаблвыканкама, начальнік аддзела па рабоце са СМІ галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ларыса КОРШУН**, якая ўваходзіць у склад дэлегацыі.

Як вядома, Нясвіж быў адным з пачынальнікаў балетнай школы ў класічным разуменні гэтага слова.

— Тое, што прапаноўвае кітайскі бок, — гэта цудоўна. І мы будзем рады сумеснаму творчаму супрацоўніцтву, — сказаў **Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ.**

Ужо вядома, што копія Нясвіжскага палаца зойме плошчу больш за 2,5 тысячы квадратных метраў. Старыя аб'екты, размешчаныя на будучай будаўнічай пляцоўцы, пойдуць пад знос.

Урад горада Чунцын удзяляе асаблівую ўвагу гэтаму праекту. «Мы верым, што ён будзе карыстацца цікавасцю як сярод айчынных, так і сярод замежных турыстаў і стане ўзорам супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю», — лічыць куратар праекта Хэ Бо.

Пагадненне аб інвестыцыйным супрацоўніцтве ў межах узвядзення пасёлка ў Чунцыне падпісана сёлета ў жніўні. Прадстаўнікі раёна Юйбэй гэтага горада наведалі аб'екты Мінскай вобласці. Дагаворам прадугледжана будаўніцтва двух унікальных комплексаў: кітайскага — у нашым цэнтральным рэгіёне, беларускага — у Чунцыне. Пасёлак на Міншчыне размесціцца на ўчастку ў 100 гектараў. У забудове будуць выкарыстаны прататыпы дамоў культуры Чунцына і тыповых будынкаў усходняй часткі правінцыі Сычуань.

— Турызм, гандаль і культурныя абмены — асноўныя функцыі новабудоўляў, — дадала Ларыса Коршун.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ООО «МегаЛес»** (УНП 490984427) в лице ликвидатора Лопухова Д. М.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **15 октября 2019 г**. **09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Перфоратор, инв. № 0000000045 | 156,22 |
| 2 | Углошлифмашинка (Германия), инв. № 0000000053 | 144,91 |
| 3 | Шлифмашинка, инв. № 0000000059 | 83,98 |
| 4 | Автопогрузчик вилочный, мод 40814, инв. № 0000000020 | 3778,38 |
| 5 | Бетономешалка 125 л, инв. № 0000000041 | 73,46 |
| 6 | Бетономешалка BWE-B-260S, инв. № 0000000021 | 293,87 |
| 7 | Влагомер, инв. № 0000000044 | 377,83 |
| 8 | Комплект СКРТ-25 Терминао онлайт, инв. № 0000000040 | 480,69 |
| 9 | Комплект тахографа МТСО324 с импульсным датчиком, инв. № 0000000067 | 2,94 |
| 10 | Кондиционер Panassonic, инв. № 0000000070 | 86,06 |
| 11 | Ленточный станок LT15S4E15S+SW10+Debarker, инв. № 0000000081 | 4198,20 |
| 12 | Многофункциональное устройство CANON MF 4018, инв. № 0000000071 | 130,14 |
| 13 | Монитор 20 LG W2043S PF, инв. № 0000000016 | 31,48 |
| 14 | Монитор LS19, инв. № 0000000017 | 119,57 |
| 15 | Монитор LSD Yiewsonic-YA 1913W, инв. № 0000000072 | 14,32 |
| 16 | Принтер CE 461 F HP LASER Jet P2035, инв. № 0000000074 | 104,95 |
| 17 | Приспособление для заточки лент. пил ПЗП10-00,000, инв. № 0000000088 | 498,53 |
| 18 | приспособление для разводки ленточных пил ПРП11-00, инв. № 0000000089 | 125,94 |
| 19 | ПЭВМ «Логос» А 1250, инв. № 0000000073 | 157,49 |
| 20 | ПЭВМ «Логос» А250, инв. № 0000000019 | 157,49 |
| 21 | Рама лесопильная Р-63, инв. № 0000000023 | 3778,38 |
| 22 | Сварочный аппарат, инв. № 0000000014 | 50,00 |
| 23 | Станок деревообраб. вертикально-фрезерный Ф130-04, инв. № 0000000093 | 839,64 |
| 24 | Станок деревообрабатывающий комбинированный, инв. № 0000000048 | 419,82 |
| 25 | Станок СПС 440, инв. № 0000000092 | 1889,19 |
| 26 | Станок токарный ТП40, инв. № 0000000052 | 503,78 |
| 27 | Станок точильно-шлифовальный, инв. № 0000000015 | 293,87 |
| 28 | Факс Panasonic KX-FT 982 RU-B, инв. № 0000000078 | 52,47 |
| 29 | Шлифовальный станок ШЛПС-6м, инв. № 0000000055 | 839,64 |
| 30 | Щиты вводные силовые и осветительные, инв. № 0000000037 | 20 000,00 |
| 31 | Электронные цифровые системы, инв. № 0000000061 | 1170,24 |
| 32 | Электростанция ЭСД-50-ВС-400 № 8401024, инв. № 0000000079 | 2497,92 |
| 33 | А/м грузовой ГАЗ-3507 1 7 ММ 64-01, инв. № 0000000082 | 3778,38 |
| 34 | Автобус ПАЗ 320530, инв. № 0000000001 | 5037,84 |
| 35 | Автомобиль КрАЗ-255Б1 с автоцистерной, инв. № 0000000064 | 3148,65 |
| 36 | Автомобиль МАЗ 64229-032, инв. № 0000000004, полуприцеп МАЗ-998640-(010), инв. № 0000000026 | 10 000,00 |
| 37 | Автомобиль УАЗ 390995-330, инв. № 0000000006 | 3778,38 |
| 38 | МАЗ 5337, инв. № 0000000031 | 1000,00 |
| 39 | Прицеп ГКБ, инв. № 0000000032 | 500,00 |

Местонахождение – Гомельская обл., Калинковичский р-н, Малоавтюковский с/с, 6/3, тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 14.10.2019 г. до 17.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 06.09.2019 г.

## Извещение о проведении повторных электронных торгов

**Организатор аукциона:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 4б.

**Продавец:** КПДУП «Слуцкое управление производственно-технологической комплектации», Минская обл., г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, д. 5.

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б

| | |
|---|---|
| Адрес ЭТП | **www.ipmtorgi.by** |

Предмет электронных торгов – транспорт, спецтехника, оборудование (бывшее в употреблении).

Местоположение: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, 1-й пер. Толстого, д. 5

| № лота | Наименование | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Полуприцеп-цистерна ТЦ 13 (рег. знак А 4427 А-5), инв. номер 772 | 1 280,00 | 64,00 |
| 2 | Автокран МАЗ 5334 (рег. знак АВ 4532-5), инв. № 1386 | 5 280,00 | 264,00 |
| 3 | Прицеп МАЗ 857100 010 (рег. знак А 4554 А-5), инв. номер 1531 | 2 320,00 | 116,00 |
| 4 | Седельный тягач MAZ 6422 A5-320 (рег. знак АЕ 6800-5), инв. номер 1533 | 8 080,00 | 404,00 |
| 5 | Автомобиль GAZ-31105 (рег. знак 1515 ЕК-5), инв. номер 1564 | 1 120,00 | 56,00 |
| 6 | Щетка дорожная НО-86 (зав. № 1630) | 456,00 | 22,80 |
| 7 | Вагон-бытовка, инв. номер 295 | 2 080,00 | 104,00 |
| 8 | Дом-вагон, инв. номер 299 | 2 160,00 | 108,00 |
| 9 | Станок СТД-9А, инв. номер 437 | 3 680,00 | 184,00 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 15.00, Шкурский Александр Владимирович, 8-029-691-36-99

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **10** (десять) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **5 (пяти)** дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» 17.07.2019 г.

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 21.10.2019** в 11.00, каждый следующий лот с интервалом 10 минут, на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by)**

Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): **17.10.2019** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by)**

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.**
**E-mail: auction@cpo.by**

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

